Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

№191 (28555)

4 КАСТРЫЧНІКА 2017 г. СЕРАДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

стар. 9–16

**Праблемы маладых спецыялістаў…**

**Ганарыцца агульнай спадчынай**

СТАР. 5

**Трактар «Беларус» на фрэсцы храма**

СТАР. 7

## ЦЫТАТА ДНЯ

**Андрэй ГАЕЎ, старшыня Дзяржаўнага камітэта па маёмасці**

*«Праект змяненняў ва Указ №100 «Аб мерах па ўдасканаленні ўліку і скарачэнні колькасці пустых і старых дамоў у сельскай мясцовасці» ўдасканаліць працэдуру ўключэння гэтых аб'ектаў у абарот. Сёння пры згодзе ўласніка знос старых аб'ектаў ажыццяўляецца за кошт выканкама, праектам жа прапануецца ажыццяўляць выдачу зямельных участкаў з умовай зносу старых аб'ектаў новымі ўласнікамі. Акрамя таго, праектам спрашчаецца працэдура продажу старых і пустуючых дамоў».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 04.10.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | | 1,9655 ▲ |
| Еўра | | 2,3069 ▲ |
| Рас. руб. | | 0,0339 ■ |
| Укр. грыўня | | 0,0735 ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# Кастрычніцкі «поезд»

Фота БЕЛТА.

■ Жыллё

## КОЖНАЯ ЧАЦВЁРТАЯ КВАТЭРА — У ДОЎГ

**Людзі, якія жадаюць палепшыць жыллёвыя ўмовы, усё часцей сталі разлічваць на банкаўскія крэдыты**

**Ужо сёмы раз сёлета зніжаецца стаўка рэфінансавання. Для ахвотных набыць кватэру гэта азначае яшчэ большае «патанненне» крэдытаў. У выніку на рынку нерухомасці колькасць здзелак з крэдытнымі сродкамі павялічваецца штомесяц. З пачатку года колькасць здзелак па куплі кватэр з прыцягненнем крэдытаў выраслa ў шэсць разоў. Якія сумы і на якія кватэры бяруцца ў пазыку ў банкаў і ці будзе расці попыт на крэдыты ў далейшым?**

### КРЭДЫТЫ ЎЖО НЕ КУСАЮЦЦА

Разам са зніжэннем стаўкі рэфінансавання памяншаліся і стаўкі па крэдытах. Прычым калі стаўка рэфінансавання за няпоўныя тры кварталы бягучага года зменшылася на 5,5% (з 17% да 11,5%), то мінімальныя стаўкі па крэдытах «скінулі» 7% — з 18,5% да 11,5%. Гэта адбілася і на іх запатрабаванасці з боку пакупнікоў жылля. Так, па інфармацыі экспертаў рынку нерухомасці, цяпер кожная чацвёртая кватэра на другасным рынку купляецца за крэдытныя грошы.

Разам са зніжэннем ставак па крэдытах мы назіраем істотны рост цікавасці пакупнікоў жылля да прапаноў банкаў. «Яшчэ ў пачатку года магчымасць прыцягнення крэдыту для набыцця квадратных метраў разглядалі лічаныя нашы кліенты. А цяпер жа толькі за жнівень нашы іпатэчныя кансультанты апрацавалі больш за 600 першасных зваротаў па куплі кватэры з прыцягненнем крэдыту», — расказвае **намеснік дырэктара па продажы на другасным рынку жылля агенцтва нерухомасці Святлана КУДЗЕЛКА.**

СТАР. 4

■ Будзьце пільныя!

## НЕ ЗАСТАЦЦА ЗА ЗІМУ БЕЗ ШКАРПЭТАК І ХАЛАДЗІЛЬНІКА

### Як засцерагчы сваю дачу

**Раней у домікі за горадам звозілі ўсё, што было непрыдатна для гарадской кватэры, а цяпер яны нярэдка выглядаюць як узоры са старонак інтэр'ерных часопісаў. Нават калі скуранyя канапы і электракаміны сустракаюцца не паўсюль, то тэлевізары з вадкакрышталічным экранам і іншая бытавая тэхніка ўжо даўно сталі прадметамі ўжытку у тым ліку і ў дачным жыцці. Гэты факт разам з дрэннай абароненасцю загараднага жылля робіць яго асабліва прыцягальным для зладзеяў. Пра тое, як не дапусціць пасягальніцтваў на сваю маёмасць, расказаў начальнік арганізацыйна-аналітычнага ўпраўлення міліцыі грамадскай бяспекі МУС Ігар ГАТАЛЬСКІ.**

Праблема дачных крадзяжоў носіць сезонны характар і абвастраецца ў перыяд з кастрычніка па сакавік, калі ў загарадным доме адсутнічаюць людзі, якія пастаянна там пражываюць ці хоць бы часта наведваюцца. Сёлета з дачных дамоў здзейснена амаль паўтары тысячы крадзяжоў. Іх колькасць паступова зніжаецца, аднак па-ранейшаму застаецца немалой.

Праблема ў тым, што большасць дачнікаў дзейнічаюць па адным сцэнарыі: убралі ўраджай, зладзілі «закрыццё сезона», на наступны дзень зачынілі дзверы на ключ і ўсё — да пабачэння, сустрэнемся ў красавіку. Але вясной часам прыходзіцца ўладкоўваць усё спачатку, таму што ўладальнікі прыязджаюць і знаходзяць толькі чатыры голыя сцяны. Добра, што яшчэ хату немагчыма звезці (хоць быў аднойчы і такі выпадак). Напасці на след злачынцаў вельмі складана, бо невядомы перыяд здзяйснення крадзяжу, страчаны з-за змен надвор'я сляды: адбіткі пальцаў, сляды ног і колаў.

СТАР. 4

# ПАРАДАК ЯК АРЫЕНЦІР

## Прэзідэнт патрабуе прывесці «ў ідэальны стан» усю тэрыторыю дзяржавы

**У Палацы Незалежнасці працягваецца абмеркаванне найважнейшых нарматыўна-прававых актаў, прадстаўленых для разгляду кіраўніку дзяржавы. Учора пад кіраўніцтвам Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі адбылася нарада па праекце новай рэдакцыі Жыллёвага кодэкса і пытаннях удасканалення заканадаўства па скарачэнні пустуючых і старых дамоў.**

### Не проста сцены

Кіраўнік краіны ў першую чаргу пацікавіўся, ці настаў час пераглядаць заканадаўства па гэтай праблематыцы і што перашкаджае рабоце старых нарматыўна-прававых актаў, якія рэгулююць гэтыя адносіны. У той жа час Аляксандр Лукашэнка канстатаваў: тэма закранае інтарэсы амаль усіх жыхароў краіны.

— Нават тых, хто мае сёння жыллё, — дадаў беларускі лідар. — Бо рашэнне кватэрнага пытання — адзін з асноўных індыкатараў развіцця грамадства. Жыллё — гэта не проста сцены і дах над галавой, гэта месца, дзе чалавек, прыйшоўшы з работы, можа адпачыць, пабыць з сям'ёй ва ўтульнай і камфортнай абстаноўцы. Самае галоўнае — гэта выхаванне нашых дзяцей.

Адпаведна, задача дзяржавы — стварыць усе ўмовы і механізмы, каб дапамагчы людзям, што маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.

— Гэты кірунак — найважнейшы складнік сацыяльнай палітыкі Беларусі, і ён застанецца, я думаю, назаўсёды, — упэўнены Прэзідэнт.

### Адзін дакумент. Зразумелы

Асноўныя пытанні, з якімі грамадзяне сутыкаюцца ў паўсядзённым жыцці, — пастаноўка на ўлік тых, хто мае патрэбу, атрыманне жылля, высяленне з яго, унясенне платы за камунальныя паслугі, кіраванне жыллёвым фондам — рэгулюе менавіта Жыллёвы кодэкс.

— Прымаючы гэты дакумент пяць гадоў таму, мы ставілі задачу ўлічыць усе аспекты і згладзіць «вострыя вуглы» ў сферы жыллёвых адносін, што назапасіліся з улікам прававпрымяняльнай практыкі, — нагадаў кіраўнік краіны. — Сёння вы прапануеце, я б сказаў, новую рэдакцыю Кодэкса.

Першае, на чым засяродзіў увагу Аляксандр Лукашэнка, ці зможа новы дакумент забяспечыць сістэмнасць і комплекснасць рэгулявання адносін у жыллёвай сферы. Ці не прыйдзецца грамадзянам пасля яго прыняцця звяртацца да некалькіх крыніц права для вырашэння сваіх пытанняў?

Другое, чым пацікавіўся Прэзідэнт, — якія канкрэтна праблемы прапануецца ўрэгуляваць гэтым законапраектам, ці прадугледжана ў ім спрашчэнне адміністрацыйных працэдур у жыллёвай сферы.

Трэцяе пытанне датычылася стварэння фонду арэнднага жылля. Кіраўнік краіны спытаў, ці зможа дзяржава задаволіць патрэбнасці грамадзян, што стаяць на ўліку тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў? Якія прапановы ўрада па развіцці гэтага важнага кірунку?

Чацвёрты аспект — тэхнічны стан жыллёвага фонду краіны ў цэлым. Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся, якія дадатковыя меры неабходны для яго належнага ўтрымання і абслугоўвання.

### Гаспадарскі падыход

Асобна Прэзідэнт звярнуўся да развіцця малых вёсак і хутароў. Гэтаму, дарэчы, беларускі лідар удзяляе асаблівую ўвагу.

— Колькасць пустуючых дамоў расце, нам неабходна стварыць умовы для эфектыўнага выкарыстання такога жылля, — падкрэсліў кіраўнік краіны. — Патрэбен, перш за ўсё, гаспадарскі падыход! Гэта ў тым ліку патэнцыял для агратурызму. Мала таго, што я ўжо запрашаў і заклікаў ахвотных — не толькі багатых людзей — не забываць сваю малую радзіму. Калі ў нейкага ёсць магчымасць прывесці ў парадак сваю вёсачку, пабудаваўшы там, можа быць, свой дом — гэта трэба зрабіць.

Што да аварыйнага жылля, пазіцыя Прэзідэнта адназначная: на зямлі павінен быць парадак.

— Такія будынкі трэба прыбіраць, і зямлю трэба вяртаць у абарот. Гэтую работу трэба паскорыць на месцах і падвесці пад гэта нарматыўна-прававы акт, каб губернатары і мясцовыя ўлады не «бегалі» за людзьмі, якія кінулі сваё жытло, але ў той жа час нібыта маюць нейкую паперку на валоданне ім. Калі ты валодаеш гэтым жыллём — займайся ім, каб яно было ў нармальным стане! — агучыў зразумелы алгарытм кіраўнік дзяржавы.

### Твар краіны

На нарадзе прысутнічалі ўсе губернатары нашых абласцей. Таму па-за рамкамі галоўных абмяркоўваемых тэм Прэзідэнт папрасіў агучыць сітуацыю з уборкай ураджаю, а таксама праблемныя пытанні, якія ў гэтым ключы трэба абмеркаваць. Акрамя гэтага, кіраўнік дзяржавы нагадаў: у будучым годзе мы прыкладзём максімум намаганняў, каб прывесці краіну ў парадак. Не толькі таму, што гэта апошні год перад Еўрапейскімі гульнямі, якія пройдуць у Беларусі ў 2019 годзе. У нашу краіну прыедуць прадстаўнікі ўсяго свету. Лагічнае пытанне: што мы ім пакажам?

— Я ўжо казаў: пачынаючы ад дарог, мастоў, а гэта — твар краіны, — прылеглых да дарог палёў, гарадоў і вёсак, пра якія мы сёння будзем весці гутарку, і заканчваючы пасяўнымі плошчамі. Усё павінна быць у ідэальным стане, — патрабаваў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў: была дамова аб уцягненні ў абарот рознага кшталту незавершанага будаўніцтва.

— Нават там, дзе я еду кожны дзень, ужо трэці губернатар стараецца паказаць, як ідзе работа, — адзначыў Прэзідэнт. — Але работы гэтай няма. Нават тыя будынкі, якія ўласнікі не могуць дабудаваць, гаворыць, забярыце іх — мы не можам вызначыцца, што там зрабіць. І гэта фактычна ў Мінску! Няўжо на ўласнасць, на памяшканні і іншае задаволілі попыт, што нават бясплатна не хочуць браць? Тады нам трэба гэтым займацца. У сувязі з гэтым мы сёння падштурхоўваем рознага кшталту грамадзян і інвестараў да будаўніцтва... Вы ведаеце мае патрабаванні — яны ўжо ў заканадаўчых актах, відаць, вызначаны — ёсць тэрміны, жалезабетонныя тэрміны, якія ў інвестыцыйных дагаворах вызначаны і для грамадзян.

### Без канфлікту

Яшчэ адна праблема, да якой звярнуўся кіраўнік краіны, — канфлікты ўлад з насельніцтвам наконт беспадстаўнага ўшчыльнення жыллёвай забудовы і высякання дрэў у населеных пунктах:

— Замест таго каб парк закласці і ў парадак прывесці, вы пачынаеце штампаваць жыллё. Месца няма, дзе жыллё будаваць? Абавязкова трэба канфлікт з насельніцтвам парадзіць? Вы самі пераселіцеся ў той дом і жывіце, а побач пабудуйце высотку ў 12 паверхаў, каб ваш дом аказаўся ў дварах гэтай высоткі. Вось пажывіце там.

Кіраўнік дзяржавы рэзка адрэагаваў на сітуацыю ў сталіцы, калі замест таго каб пракласці, як звычайна, пад дарогай камунікацыі, пачалі пілаваць векавыя дрэвы:

— Вы саджалі гэтыя дрэвы, каб іх піляваць? Кожны чалавек імкнецца выйсці, каб настрой у яго быў, на дрэвы гэтыя паглядзець. Не, усё пілуем. Мы, маўляў, новыя пасадзім недзе. Гэта вы ў сябе ў дварах спілуйце векавое дрэва і пасадзіце там дрэва з кукіш, і якая будзе ад гэтага карысць?.. Трэба спыніць гэты разбой! Маўляў, дрэва ўпадзе на дарогу... Упадзе — прыбяром! Калі сыходзіць з гэтага, трэба выпілаваць усе паркі ў гарадах.

Напрыканцы Аляксандр Лукашэнка заявіў, звяртаючыся да ўдзельнікаў нарады:

— Прашу тое, што я зараз абазначыў, мець як самае жорсткае ўказанне да вашай работы. Паўтарэння больш не будзе. На людзей трэба трошкі звяртаць увагу, а то хутка адзеравянеем, як у асобных нашых суседзяў: улада сама па сабе, а людзі — самі па сабе.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

### ❍ У тэму

**Аляксандр ЦЕРАХАЎ, міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі:**

— Новая рэдакцыя Жыллёвага кодэксу — гэта новы дакумент, не асобныя змены. Ён выкладзены ў цалкам новай рэдакцыі, якая будзе з'яўляцца настольнай кнігай для ўсіх работнікаў ЖКГ. Плануецца разгледзець Жыллёвы кодэкс на асенняй сесіі ў парламенце.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Генеральны сакратар ААН заклікаў Іспанію вырашаць праблему Каталоніі з дапамогай дэмакратыі

Генеральны сакратар ААН Антоніу Гутэрыш заклікаў іспанскія ўлады знізіць эскалацыю канфлікту вакол Каталоніі пры дапамозе дэмакратычных мер. Пра гэта на брыфінгу заявіў намеснік афіцыйнага прадстаўніка генеральнага сакратара ААН Фархан Хак, гаворыцца ў паведамленні на сайце ААН.

«Генеральны сакратар спадзяецца, што дэмакратычныя інстытуты Іспаніі знойдуць рашэнне праблемы», — сказаў Хак. Ён адзначыў, што вярхоўны камісар ААН па правах чалавека Зейд Раад аль-Хусэйн запатрабаваў, каб улады Іспаніі правялі «дбайнае, незалежнае і бесстароннее расследаванне» ўсіх актаў насілля, якія адбыліся ў дзень рэферэндуму аб незалежнасці Каталоніі 1 кастрычніка.

Тым часам па закліку прафсаюзных і іншых арганізацый Каталоніі ў аўторак, 3 кастрычніка, прайшла ўсеагульная забастоўка ў знак пратэсту супраць дзеянняў паліцыі ў дзень рэферэндуму аб незалежнасці гэтай іспанскай аўтаноміі.

### Расійская авіяцыя знішчыла камандныя і апорныя пункты тэрарыстаў на ўсходнім беразе Еўфрата

Пра гэта паведаміў у аўторак афіцыйны прадстаўнік Мінабароны Расіі генерал-маёр Ігар Канашэнкаў.

Па звестках расійскага Мінабароны, страты тэрарыстаў склалі 304 баевікі забітымі і больш за 170 параненымі, было знішчана сем палявых камандзіраў розных узроўняў.

«У тым ліку выхадзец з Казахстана Абу Іслям аль-Казакі, які ажыццяўляў каардынацыю дзеянняў штурмавых фарміраванняў ІДІЛ у даліне Еўфрата», — адзначыў Канашэнкаў. Ён таксама паведаміў, што авіяўдарам быў знішчаны цэнтр збору і падрыхтоўкі замежных наймітаў ІД, «у тым ліку каля 40 баевікоў з Паўночнага Каўказа, а таксама мабільная снайперская група тэрарыстаў».

Па словах Канашэнкава, ВКС Расійскай Федэрацыі знішчылі тры камандныя пункты і дзевяць апорных пунктаў тэрарыстаў, чатыры склады боепрыпасаў, восем танкаў, тры артылерыйскія ўстаноўкі, 17 пазадарожнікаў з усталяваным на іх буйнакаліберным узбраеннем.

### Венгрыя і Румынія будуць разам патрабаваць змяніць украінскі закон аб адукацыі

Дзве краіны будуць каардынаваць свае дзеянні ў дачыненні да новага закона Украіны «Аб адукацыі». Пра гэта заявіў кіраўнік знешнепалітычнага ведамства Венгрыі Петэр Сіярта пасля сустрэчы са сваім румынскім калегам Тэадорам Мелешкану.

«Для Венгрыі і Румыніі цалкам натуральна і нармальна сумесна ўзгадняць папраўкі да закона «Аб адукацыі» ва Украіне», — цытуе Сіярта прэс-служба венгерскага МЗС.

На мінулым тыдні ва Украіне ўступіў у сілу новы закон «Аб адукацыі». Яго сёмы артыкул, у прыватнасці, прадугледжвае, што навучанне на мовах нацыянальных меншасцяў застанецца толькі ў пачатковых класах.

## Візіт Прэзідэнта Венесуэлы

**Перагаворы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з Прэзідэнтам Венесуэлы Нікаласам Мадурам, які наведае Беларусь з афіцыйным візітам, пройдуць 5 кастрычніка ў Палацы Незалежнасці.**

Кіраўнікі дзяржаў спачатку сустрэнуцца ў фармаце «сам-насам», а затым у пашыраным складзе з удзелам членаў дэлегацый, паведамляе прэс-служба беларускага лідара. Бакі разгледзяць шырокі комплекс пытанняў гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, у тым ліку рэалізацыю двухбаковых праектаў, функцыянаванне сумесных зборачных вытворчасцяў, развіццё ўзаемадзеяння ў сельскагаспадарчай, будаўнічай, нафтагазавай і іншых сферах. Асобная ўвага будзе ўдзелена міжнароднаму парадку дня.

Плануецца, што ў гэты ж дзень Нікалас Мадура прыме ўдзел у цырымоніі адкрыцця ў Мінску помніка нацыянальнаму герою Венесуэлы Сімону Балівару.

## ■ Блізкая ўлада

# «НЯМА ТАКОГА ПЫТАННЯ, ЯКОЕ НЕМАГЧЫМА ВЫРАШЫЦЬ»

**На мінулым тыдні ў Хойніцкім раённым выканаўчым камітэце адбылася прамая тэлефонная лінія са старшынёй Хойніцкага райвыканкама Анатолем БАНДАРЭНКАМ. За тры гадзіны да яго звярнуліся 4 чалавекі — наш карэспандэнт прасачыў за ходам зносін з грамадзянамі.**

Першы званок паступіў бліжэй да канца першай гадзіны прамой лініі: мясцовы жыхар Павел К. набыў будынак у Хойніках, у якім раней вырабляліся вугалле. Цяпер ён хоча правесці там святло, аднак гэта магчыма толькі праз тэрыторыю суседняга лясгаса. Праблема заключаецца ў тым, што апошні не хоча дапамагаць Паўлу. Як вырашыць праблему? Старшыня райвыканкама прапанаваў правесці сустрэчу з усімі зацікаўленымі, каб знайсці найлепшае рашэнне.

Як прызнаўся старшыня райвыканкама, менавіта бытавыя пытанні часцей за ўсё ўзнікаюць у грамадзян. «Перыядычна да нас звяртаецца жанчына, якая скардзіцца на тое, што ў кватэры над ёй суседка гучна раскрыжоўвае костачкі, якімі корміць сваіх катоў. Але мы прымаем і такое, вядома ж, нічога без адказу не пакідаем», — сказаў Анатоль Бандарэнка.

Тое, што людзі звяртаюцца ў асноўным з жыццёвымі праблемамі, пацвердзіў наступны званок: мясцовая жыхарка Юлія В. расказала пра тое, што ў яе кватэры пачарнеў кут. Старшыня паабяцаў накіраваць да яе спецыялістаў, каб правесці экспертызу. Кватэра з'яўляецца прыватызаванай, таму найлепшае рашэнне праблемы такое: камунальныя службы ўцяпляць стыкі звонку.

— Як шмат паступае да нас заваротаў? З 1 студзеня па разнастайных прамых тэлефонных лініях — і мне, і намеснікам — мы атрымалі 72 звароты, — паведаміў Анатоль Бандарэнка пасля другога званка. — Усяго прамых ліній было 38, атрымлівалася амаль па 2 звароты на лінію. Калі мала тэлефануюць, значыць, няма праблем? Не, проста ў нас жыхары звяртаюцца ў асноўным напрамую ў неабходныя службы.

Трэці званок прыйшоўся на сярэдзіну апошняй гадзіны прамой тэлефоннай лініі. Грамадзянка Ганна У. расказала пра прарыў вады на сваім прыватным участку. Паводле яе слоў, магчыма, падтапіла калодзеж. У яе праведзена газавае ацяпленне, таму яна баіцца за захаванасць падфарбаваных камунікацый. Акрамя таго, яна папрасіла старшыню райвыканкама даслаць супрацоўнікаў дарожнай службы, каб засыпаць адну ямку. Апошняя яе просьба — прыбраць зараслі каля дома. «Вядома, з першымі двума пажаданнямі мы справімся, а вось трэцяе ўжо крыху больш складанае — гэта ж прыватны дом, гаспадары павінны самі даглядаць уласны ўчастак», — падкрэсліў Анатоль Бандарэнка. Аднак, прыняўшы пад увагу сталы ўзрост жанчыны — 84 гады, старшыня паабяцаў узяць на кантроль і трэцяе пытанне.

Чацвёрты званок паступіў літаральна праз 15 хвілін: жыхарка Хойнікаў паскардзілася на тое, што па вечарах на яе вуліцы часткова не працуе асвятленне. «Значыць, адзін ліхтар гарыць, іншы не гарыць. Зробім хутка, літаральна праз дзень усё будзе гатова», — сказаў на развітанне Анатоль Бандарэнка суразмоўніцы.

— Мне здаецца, няма такога пытання, якое немагчыма вырашыць. Усё ў нашых сілах — як бачыце, гэта жыццёвыя сітуацыі, не штосьці глабальнае. Тэлефануюць не часта, таму што нашы службы стараюцца своечасова адгукнуцца. Ды і яны ведаюць, што калі не дапамогуць, то зварот усё роўна да іх дойдзе, калі не наўпрост, то праз мяне ці намеснікаў, — адзначыў старшыня Хойніцкага райвыканкама.

Анатоль Бандарэнка запэўніў, што рэальную дапамогу атрымліваюць усе грамадзяне, якія звяртаюцца ў райвыканкам. «Узяць хаця б пошук працоўнага месца — так, нам тэлефануюць і з гэтай нагоды, — сказаў старшыня. — Звычайна мы прапануем чалавеку па 3—4 варыянты далейшага працаўладкавання. Але шмат хто адмаўляецца, хочуць высокія пасады. Але як можна стаць дырэктарам, калі нават вышэйшай адукацыі ў чалавека няма? Так і ў астатніх пытаннях — часам людзі хочуць большага, чым тое, што мы можам зрабіць».

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*

■ Парламенцкі дзённік

# НОВЫ ВІТОК УЗАЕМААДНОСІН

**Беларусі і Латвіі трэба актывізаваць сумесныя праекты ў транспартнай сферы**

**Такое меркаванне выказаў старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ на сустрэчы з латвійскай дэлегацыяй на чале з намеснікам старшыні (віцэ-спікерам) Сейма Латвійскай Рэспублікі Гундарсам ДАЎДЗЭ.**

— Ёсць шмат цікавых праграм, якія можна рэалізаваць, — адзначыў Міхаіл Мясніковіч. — Зараз мы актыўна ўключыліся ў работу па глабальным кітайскім праекце «Адзін пояс — адзін шлях»... Цалкам магчыма, што гэта можна рэалізаваць з удзелам Латвіі.

Ён таксама заўважыў, што для дзвюх дзяржаў надзвычай актуальнае інвестыцыйнае супрацоўніцтва. «Што датычыцца інвестыцый і сумесных кампаній, то тут яшчэ вельмі шмат працы», — падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч.

На сустрэчы з гэтай жа латвійскай дэлегацыяй **намеснік старшыні Савета Рэспублікі Мар'яна ШЧОТКІНА** адзначыла, што міжпарламенцкія адносіны паміж Беларуссю і Латвіяй выходзяць на абсалютна новы віток. «Сітуацыя, якая склалася ў нашых двухбаковых адносінах, — гэта 52 пагадненні і розныя дагаворы, гэта тавараабарот, які па выніках 2016 года перавысіў 260 мільёнаў долараў і ўжо за 7 месяцаў склаў практычна 70 мільёнаў долараў, гэта інвестыцыі — амаль 99 мільёнаў долараў за мінулы год, — падкрэсліла Мар'яна Шчоткіна. — Разам з тым, мы выдатна ведаем, што калі браць 2014 і 2015 гады, то тавараабарот пакуль не дасягнуў той планкі, якую мы маглі б рэалізаваць».

Асноўнымі аспектамі, якія абмеркавалі бакі, сталі будучы чэмпіянат свету па хакеі, які пройдзе ў Беларусі і Латвіі ў 2021 годзе, узаемны турызм, якасць аўтамабільных дарог, а таксама ўмовы вядзення бізнесу. «Мы дамовіліся сёння аб сумесным пасяджэнні нашых камісій, на якім будуць разгледжаны канкрэтныя пытанні і будуць прапаноўвацца рашэнні», — дадала Мар'яна Шчоткіна.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*

■ Дыялог бізнесаў

# УСЕ ДАРОГІ ВЯДУЦЬ У МІНСК

**Больш за 70 лагістычных і транспартных арганізацый з 9 краін свету сустрэліся ў сталіцы на пляцоўцы футбольнага манежа. У Мінску з 3 па 5 кастрычніка праходзіць транспартны тыдзень, у рамках якога адзінаццаты раз адкрылася выстава «Транспарт і лагістыка».**

«Асноўная тэма пленарнага пасяджэння — злучэнне праектаў ЕАЭС і праекта «Шаўковы шлях», — адзначыў у прывітальным слове **міністр транспарту і камунікацый Анатоль СІВАК.** Ён падкрэсліў, што актуальным для транспартнай сферы з'яўляецца ўдзел у мерапрыемстве прадстаўнікоў Міністэрства сувязі і інфарматызацыі, якія дапамагаюць паскарэнню працэсу транспарціроўкі грузаў і пасажыраў.

**Намеснік дзяржаўнага сакратара Міністэрства зносін Латвіі Улдзіс РЭЙМАНІС** у сваю чаргу паведаміў, што Латвія кожны раз прысутнічала на выставе і сёлета яе экспазіцыю дапоўніў авіяцыйны сектар.

**Старшыня Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Андрэй РЫБАК** лічыць, што Беларусь з'яўляецца важным транспартным калідорам паміж Еўропай і Азіяй. «Парламент надае транспартнай сферы вялікае значэнне. Мы пастаянна працуем над развіццём заканадаўства для таго, каб бізнес у нашай краіне адчуваў сябе камфортна», — запэўніў Андрэй Рыбак.

У ходзе мерапрыемстваў разгледзяць пытанні арганізацыі пасажырскіх перавозак, удасканалення перавозак грузаў, кантэйнерызацыі і эфектыўнага кіравання ў ланцугах паставак, гарантыі бяспекі руху і эксплуатацыі транспарту. Сярод удзельнікаў выставы транспартна-лагістычныя цэнтры, вытворцы і дылеры аўтатэхнікі, пастаўшчыкі спецыялізаванага абсталявання, страхавыя кампаніі, адміністрацыі марскіх партоў і кіраўніцтва чыгунак з СНД, блізкага і далёкага замежжа. Для ўсіх удзельнікаў будзе арганізавана насычаная дзелавая праграма з магчымасцю знайсці новых дзелавых партнёраў.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

■ Ва ўрадзе

# НЕ ЗМАГЛІ ПАДЗЯЛІЦЬ НА ТРЫ

**Андрэй Кабякоў агучыў вынікі экспартнай дзейнасці краіны**

**Экспарт тавараў і паслуг у студзені—ліпені вырас на 19,5% у параўнанні з аналагічным перыядам летась. Пра гэта расказаў прэм'ер-міністр Андрэй Кабякоў падчас пасяджэння Прэзідыума Савета Міністраў, якое прайшло ў сталіцы. На мерапрыемстве абмяркоўваліся вынікі работы па нарошчванні і дыверсіфікацыі экспарту. Пры гэтым пытанне дыверсіфікацыі ўсё яшчэ застаецца адкрытым.**

## ПРЫРАСЛІ Ў ТАВАРАХ І ПАСЛУГАХ

Па інфармацыі кіраўніка ўрада, экспарт тавараў вырас на 21,1%, а паслуг — на 14,8%. Рост экспарту паслуг адбыўся за кошт павелічэння транспартных, камп'ютарных, тэлекамунікацыйных і шэрагу іншых паслуг. Іх доля ў агульным аб'ёме экспарту склала 20,9%.

На думку Андрэя Кабякова, найважнейшай задачай для айчынных паставак з'яўляецца як захаванне і ўмацаванне пазіцый у Расіі, так і павелічэнне аб'ёмаў вытворчасці і дыверсіфікацыя наменклатуры тавараў для экспарту ў ЕС і іншыя краіны. Пры гэтым ён адзначыў, што Нацыянальнай праграмай развіцця і падтрымкі экспарту на 2016—2020 гады пастаўлена задача нарасціць долю экспарту паслуг да 22% у 2017 годзе і да 25% у 2020 годзе ў агульным аб'ёме экспарту.

## З 14 ДЗЯРЖАВАМІ ТРЭБА ЯШЧЭ ПАПРАЦАВАЦЬ

Падчас пасяджэння прэм'ер-міністр нагадаў, што Прэзідэнт паставіў задачу па раўнамерным размеркаванні экспарту паміж ЕАЭС, ЕС і іншымі краінамі. «А гэта размеркаванне пакуль не выконваецца. На долю краін ЕАЭС у студзені—ліпені 2017 года пайшло 47,8%, з іх на долю Расіі — 45,3%, краін Еўрапейскага саюза — 26,5%, астатніх краін — 25,7%. Экспарт у Расію вырас на 24,4% і склаў 7,2 млрд долараў. Сёння на гэты рынак ідуць амаль усе пастаўкі мясной і малочнай прадукцыі, абутку, звыш 80% агульнага аб'ёму халадзільнікаў, маразільнікаў, камбайнаў, прыкладна тры чвэрці грузавых аўтамабіляў», — распавёў Андрэй Кабякоў. Ён таксама адзначыў, што ў краіны «далёкай дугі» экспарт вырас на 19,2% і склаў 1,8 млрд долараў. «Трэба павялічваць не толькі аб'ёмы калійных угнаенняў на рынкі гэтых краін, але і актыўна нарошчваць экспарт прадукцыі машынабудавання, сельскагаспадарчых і харчовых тавараў. І тут важная актыўная работа службовых асоб, якія замацаваныя за гэтымі краінамі па геаграфічнай дыверсіфікацыі экспарту», — падкрэсліў кіраўнік урада. Ён удакладніў, што па 14 дзяржавах заданні па росце экспарту тавараў пакуль не выконваюцца. Пры гэтым агульныя паказчыкі па экспарце тавараў і паслуг выкананы ўсімі органамі дзяржкіравання і выканкамамі. «Гэта, безумоўна, вельмі добры вынік, аднак задача па нарошчванні экспарту на новыя перспектыўныя рынкі ў поўным аб'ёме не выконваецца. Гэта сведчанне таго, што тых мер, што прымаюцца, недастаткова, і неабходна далейшая канцэнтрацыя намаганняў у гэтым кірунку», — падкрэсліў Андрэй Кабякоў. Паводле яго слоў, асаблівую ўвагу кіраўнікам міністэрстваў, канцэрнаў, выканкамаў неабходна ўдзяліць выкананню дамоўленасцяў па выніках візітаў з удзелам кіраўніка дзяржавы.

## ДВА СЦЭНАРЫІ

Нягледзячы на тое, што вынікі экспартнай дзейнасці падводзіць яшчэ рана, ва ўрадзе ўжо ёсць бачанне, на якія лічбы можна будзе выйсці да канца года. Як расказаў першы намеснік міністра замежных спраў Андрэй Еўдачэнка, рост экспарту Беларусі ў 2017 годзе па песімістычным сцэнарыі складзе 5—7%, аптымістычным — да 15%. «Прыкладна ў лістападзе летась мы пачалі прырастаць упершыню па экспарце пасля трох гадоў падзення. Таму ў чацвёртым квартале будзе значна складаней гэтыя працэнты адваёўваць», — растлумачыў Андрэй Еўдачэнка. Ён таксама паведаміў, што за сем месяцаў сёлета структура беларускага экспарту зведала змены. Так, 83% прыросту экспарту далі несыравінныя тавары. У асноўным гэта складаная прадукцыя машынабудавання і тэхнічная, прадукты харчавання і сельскай гаспадаркі.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryhevich@zviazda.by*

■ Небяспека

# НЕ АДПУСКАЕ ГРЫБНЫ СЕЗОН...

У лясах па-ранейшаму губляюцца людзі

**За мінулыя суткі работнікі МНС тры разы выязджалі на пошукі грыбнікоў, якія заблудзіліся.**

Так, рэчыцкія ратавальнікі шукалі ў лесе каля вёскі Дземяхі сямейную пару. Тыя яшчэ 1 кастрычніка ўдзень сышлі ва ўгоддзі па грыбы і згубіліся. Былі задзейнічаны і работнікі міліцыі. У 12.45 зніклыя былі знойдзены супрацоўнікамі МНС, у медыцынскай дапамозе не мелі патрэбы. Ратавальнікам з Мсціслава паведамілі пра мужчыну і жанчыну, якія заблукалі ў лесе каля вёскі Гімбатаўка. 2 кастрычніка ў 16.00 яны сышлі ў лес і не змаглі знайсці выхад самастойна. Для правядзення пошукаў былі задзейнічаны работнікі МНС і РАУС. У 20.06 грыбнікі выйшлі з лесу на гукі сірэны аўтамабіля МНС. Пасля агляду медыцынскай брыгадай яны былі адпушчаныя дадому.

А ў лясным масіве каля вёскі Ляхаўшчына Вілейскага раёна шукалі жанчыну. Пенсіянерка каля 12.00 сышла ў лес па грыбы і заблудзілася. Неабходная была дапамога ратавальнікаў. У 00.05 жанчына выйшла з лесу самастойна, у медыцынскай дапамозе не мела патрэбы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Святочны настрой

# УВАГА! ЛЭДЗІ НА ВЕЛАСІПЕДЗЕ!

**Кветкі, стужкі і спадніцы... Як гродзенкі на веласіпедны шпацыр выйшлі**

**Акцыя прайшла ў падтрымку веласіпеднага руху з удзелам жанчын. Арганізатары ставяць задачу дабіцца гендарнага парытэту на веладарожках горада.**

— Пакуль у горадзе пераважная колькасць веласіпедыстаў — мужчыны, — паведаміла **старшыня грамадскай арганізацыі «ВелаГродна» Юлія КАЛЯДА.** — Але мы спадзяёмся, што наш рух падтрымаюць і прадстаўніцы прыгожай часткі чалавецтва, калі ўбачаць, як элегантна выглядае жанчына на веласіпедзе. На гэта і накіравана наша акцыя.

На заклік арганізатараў адгукнуліся некалькі дзесяткаў жанчын усіх узростаў. **Ірына БЯЛЯЎСКАЯ** прызналася, што яна ўжо бабуля, і цяпер у паездкі па горадзе бярэ з сабой унука. Сама яна, колькі сябе памятае, заўсёды са сваім двухколавым сябрам штодзень не менш пяці гадзін раз'язджае па горадзе. Нават на спевы ў царкоўным хоры прыязджае на веласіпедзе, праўда, бярэ з сабой адзенне і туфлі на абцасах. Па словах жанчыны, пастаянныя трэніроўкі зрабілі яе вельмі вынослівай — Ірына можа адолець самы круты пад'ём. Адпраўляючыся на шпацыр па горадзе, жанчына ўпрыгожыла свой веласіпед яркім восеньскім букетам.

**Вольга ГАЎРЫЛІК, гродзенская прадпрымальніца,** выдзяляецца яркім адзеннем. На кашулю-вышыванку надзета лімонная велакуртка. Доўгая спадніца з лёгкай аранжавай тканіны завяршае рамантычны вобраз.

— Я яшчэ ніколі не ездзіла на спартыўным веласіпедзе ў доўгай спадніцы і вось вырашыла паспрабаваць. Атрымоўваецца нядрэнна, дзякуючы таму, што збоку разрэз. Думаю, што праеду дыстанцыю без праблем, — упэўнена веласіпедыстка.

Вольга займаецца мядовым бізнэсам. Яе прадпрыемства знаходзіцца за 35 кіламетраў ад горада. Таму на работу яна ездзіць на аўтамабілі, а вось па выхадных абавязкова па 15—18 кіламетраў у лесапарку накручвае на сваім веласіпедзе. Кажа, што менавіта такія паездкі яе больш за ўсё жывяць як фізічна, так і эстэтычна, бо веладарожкі праходзяць па маляўнічых кутках лесапаркавай зоны.

Пакуль адны ўдзельніцы акцыі толькі падцягваліся ў гарадскі парк, іншыя спаборнічалі ў конкурсе на лепшае манеўраванне. Найбольш спрытнымі аказаліся юныя веласіпедысткі. Многія ўдзельніцы ўпрыгожылі свае транспартныя сродкі стужкамі, кветкамі, кошыкамі з гароднінай. Стыльны каляровы картэж накіраваўся па пешаходнай вуліцы да ўзбярэжжа Нёмана. На працягу ўсяго маршруту яго суправаджалі фатографы, якія вызначылі самы прыгожы веласіпед і самую прыгожую велалэдзі.

Па словах Юліі Каляды, першы заезд аказаўся ўдалым. Такія акцыі будуць працягвацца і надалей. Аранізатары мяркуюць, што велалэдзі ў хуткім часе могуць скласці 50% усіх удзельнікаў веларуху ў Гродне.

### НАША ДАВЕДКА:

*Акцыя «Лэдзі на веласіпедзе» прайшла ў рамках Тыдня устойлівага развіцця. Мерапрыемствы будуць доўжыцца на працягу лістапада і пройдуць па ўсёй краіне. Гэта круглыя сталы, конкурсы, экалагічныя экскурсіі, мясцовыя фестывалі і святы, інфармацыйныя і адукацыйныя акцыі.*

**Маргарыта УШКЕВІЧ.** *margo@zviazda.by*

# НЕ ЗАСТАЦЦА ЗА ЗІМУ БЕЗ ШКАРПЭТАК І ХАЛАДЗІЛЬНІКА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— У першую чаргу мы стараемся працаваць на прадухіленне злачынстваў. Міліцыя ладзіць пастаянныя рэйды, адпрацоўкі аўтадарог, чыгуначных станцый і прылеглых да іх тэрыторый. Аднак у найбольш папулярных для загараднага адпачынку раёнах, асабліва паблізу Мінска і іншых буйных гарадоў, колькасць дачных дамоў вылічаецца дзясяткамі тысяч. Таму нельга забываць, што адказнасць за бяспеку кладзецца таксама і на гаспадароў, — адзначыў Ігар Гатальскі.

Дачныя крадзяжы бываюць розных тыпаў. Раней асабліва пакутавалі дачныя дамы, якія знаходзяцца непадалёк ад Мінска побач з чыгункай. Асацыяльныя элементы прыязджалі ноччу на электрычцы ў садовае таварыства і ў літаральным сэнсе цягнулі з двара і хаты ўсё, што дрэнна ляжыць. Цяпер нярэдкія выпадкі, калі дзейнічае некалькі чалавек, прычым рыхтуюцца яны старанна, выкарыстоўваючы для вывазу скрадзенага аўтамабіль. Нядаўна падобны выпадак здарыўся ў Валожынскім раёне. Гаспадары ў канцы жніўня не прыязджалі на дачу ўсяго 10 дзён. За гэты час злачынцы вынеслі ўсё, пачынаючы ад шкарпэтак, піжам, відэльцаў і лыжак, заканчваючы халадзільнікам, газавай плітой і вуглавой канапай. Каб гэтага не адбылося, дастаткова прытрымлівацца простых парад, прыведзеных ніжэй.

## НА ШТО ЗВЯРНУЦЬ УВАГУ?

❍ Заканчваючы дачны сезон, лепш па магчымасці вывезці каштоўныя рэчы ў горад. Або разукамплектаваць іх, схаваць ці перамясціць у цяжкадаступныя для злодзеяў месцы.

❍ Вокны ў доме павінны быць завешаны. У ідэале на іх варта паставіць краты: ёсць здымныя варыянты, якія можна прыбіраць на летні перыяд.

❍ Трэба пераканацца ў надзейнасці устройстваў, якія зачыняюцца, у тым ліку і ў гаспадарчых пабудовах. Калі яны занадта хісткія, каштоўныя інструменты лепш перанесці ў дом.

❍ Практыка паказвае, што надзейна агароджаныя дачы, з высокім плотам і зачыненымі варотамі, радзей падвяргаюцца крадзяжам. Асабліваю ўвагу трэба ўдзяляць дамам, якія стаяць на ўскраінах.

❍ Калі гэта дачнае таварыства, то мэтазгодна агульным сходам вызначыць нейкую перыядычнасць дзяжурстваў або выдаткаваць сродкі, каб наняць вартаўніка.

❍ Дом таксама можна ўзяць пад ахову: падрабязнасці заключэння дагавора растлумачаць у адпаведным падраздзяленні аховы па месцы размяшчэння дачнага ўчастка.

❍ Сродкамі ахоўнай сігналізацыі дачу можна абсталяваць і самастойна. Гэта могуць быць, напрыклад, датчыкі руху, якія спрацоўваюць на адкрыццё ўваходных дзвярэй — загараецца святло або гучыць сірэна. Калі гэта не прадухіліць праніканне, то спалохае парушальніка і прыцягне ўвагу суседзяў.

❍ Нядрэнны варыянт — GPS-сігналізацыя: на тэлефон прыходзіць паведамленне, калі адчыняюцца ўваходныя дзверы. Потым гаспадар прымае рашэнне: тэлефанаваць у міліцыю, суседзям або ехаць на месца самому. Прыбор адносна недарагі і просты ў выкарыстанні.

❍ Самы бюджэтны спосаб «адпужвання» — муляж відэакамеры, прычым ёсць варыянты на батарэйках, у якіх для праўдападабенства міргае чырвоная лямпачка.

❍ Не лішнім будзе ўсталяваць кантакты з суседзямі і папрасіць іх прыглядаць за домам, прынамсі, калі ён размешчаны ў вёсцы.

❍ Не варта расказваць пра закрыццё дачнага сезона ў сацыяльных сетках, асабліва згадваючы, што вяртацца вы не збіраецеся да вясны.

**Дар'я КАСКО.**
*kasko@zviazda.by*

# У ЕЎРАПЕЙСКІМ КАНТЭКСЦЕ

## Вандроўка па мясцінах, звязаных з першадрукаром

**З 8-га па 18 кастрычніка мясцовы дабрачынны фонд «Спадчына Міхала Клеафаса Агінскага» з Маладзечна і Беларускі фонд культуры здзейсняць міжнародную праграму «Шляхамі Францыска Скарыны: да 500-годдзя выдання Пражскай Біблії».**

Беларуская дэлегацыя наведае Кракаў, Прагу, Падую, Фларэнцыю і Рым. У сталіцы Італіі адбудзецца кульмінацыйная падзея праекта — у базіліцы Святога Клімента ад імя беларускай грамадскасці будзе ўстаноўлена мемарыяльная дошка ў гонар братоў Кірылы і Мяфодзія аўтарства беларускага скульптара Валерыя Янушкевіча. Як адзначыў **адзін з арганізатараў праграмы «Шляхамі Францыска Скарыны...» Пятро КРАЎЧАНКА,** яны звярнуліся да Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі, Мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага Паўла, а таксама да Мітрапаліта Мінска-Магілёўскай архіепархіі Рымска-каталіцкай царквы архібіскупа Тадэвуша Кандрусевіча з просьбай даслаць кароткія пасланні з нагоды ўсталявання мемарыяльнай дошкі ў гонар братоў Кірылы і Мяфодзія, а таксама заклікаць мясцовых італьянскіх вернікаў прысутнічаць на яе адкрыцці. Краўчанка дадаў, што мітрапалітаў абодвух найбуйнейшых беларускіх канфесій будуць вельмі рады бачыць з афіцыйнымі візітамі падчас вандроўкі, з адпаведнымі запрашэннямі да іх ужо звярнуліся.

— Наша паездка будзе суправаджацца прэс-канферэнцыямі, канцэртамі, — адзначыў **намеснік старшыні савета Беларускага фонду культуры Тадэвуш СТРУЖЭЦКІ.** — Мы ладзім перасоўную выстаўку, каб хоць бы невялікімі штрыхамі паказаць здабыткі нашай нацыянальнай культуры. Пастараемся прадставіць усе кніжныя выданні, прысвечаныя Скарыну, якія выйшлі ў Беларусі. Думаецца, што гэта будзе цікава тым, хто завітае на нашы імпрэзы і сустрэчы. Павязём таксама работы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, прысвечаныя першадрукару і мясцінам, з ім звязаным. Выставім некалькі графічных твораў, памятныя медалі, манеты. Каб паказаць, што ў Беларусі не толькі ўшанаваны першадрукар, але і добра ведаюць імёны тых творцаў, якія стваралі работы ў яго гонар.

Праект «Шляхамі Францыска Скарыны...» падтрымліваецца Міністэрствам замежных спраў Беларусі, пасольствамі Італіі, Германіі, Польшчы і Літвы. Яго прафінансавала Прадстаўніцтва Еўрапейскага Саюза ў Беларусі і Праграма Еўрасаюза «MOST».

**Заслужаны дзеяч культуры, галоўны дырыжор сімфанічнага аркестра Маладзечанскага музычнага каледжа імя М. Агінскага Рыгор САРОКА,** які таксама з'яўляецца каардынатарам вандроўкі, распавёў пра яшчэ аднаго слыннага беларуса, памяць пра якога ўдалося ўшанаваць належным чынам:

— Я паклаў шмат гадоў свайго жыцця дзеля ўслаўлення і вяртання памяці аб Міхале Клеафасе Агінскім на беларускую зямлю. Маладзечанскі музычны каледж імя Агінскага, музей у Залессі і Смаргонскі райвыканкамам — разам мы стварылі фонд «Паўночныя Афіны». Яго мэтай было завяршэнне аднаўлення сядзібы кампазітара. Удалося атрымаць еўрапейскі грант, да справы далучыўся наш Савет Міністраў — і ўжо можна паехаць у Залессе і пабачыць адрэстаўраваны маёнтак, куды сёння імкнецца шмат турыстаў...

Як бачым, беларуская зямля багатая на слынныя імёны. Памяць пра іх ашчадна захоўваецца. Яна і дагэтуль яскрава ўпісвае нашу культуру ў еўрапейскі кантэкст, стварае надзейную глебу для новых дасягненняў.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.** *nina@zviazda.by*

# КОЖНАЯ ЧАЦВЁРТАЯ КВАТЭРА — У ДОЎГ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Яшчэ адна цікавая тэндэнцыя: калі летась узяць у доўг у банкаў рашаліся толькі неабходную вам суму цаны кватэры, то сёння многія прадугледжваюць і кошт будучага рамонту. У гэтым выпадку пакупнікі бяруць крэдыт «з запасам». Па словах эксперта, сумы крэдытавання істотна адрозніваюцца — многае залежыць ад штомесячнага заробку патэнцыйнага кліента.

Сярэдняя сума крэдыту, як на куплю кватэр другаснага рынку, так і новабудоўляў, прыкладна аднолькавая. У жніўні яна складала 55—60 тысяч рублёў, або 28—30 тысяч долараў. Мінімальныя сумы пачынаюцца ад 17,5 тысячы рублёў, або 9 тысяч долараў. Максімальныя ў канцы лета дасягалі 116 тысяч рублёў, або 60 тысяч долараў, — пры куплі кватэр другаснага рынку — і 103 тысяч рублёў, або 53 тысяч долараў, — пры куплі новабудоўляў. На другасным рынку пераважная большасць пакупнікоў з крэдытамі мінчане — іх больш за 80%. У дачыненні да сталічных новабудоўляў іншагародніх пакупнікоў больш — каля 35%.

## КРЭДЫТ ЯК ВЫЙСЦЕ

Доля пакупнікоў з крэдытамі на другасным рынку жылля гэтай зімой складала 5%, вясной — 16%, летам — 20%, а ўжо ў верасні павялічылася да 30%. На думку Святланы Кудзелкі, пры захаванні цяперашняй эканамічнай сітуацыі запатрабаванасць крэдытаў на другасным рынку жылля будзе павялічвацца і надалей. Нават калі стаўкі па крэдытах будуць заставацца без змен.

Аналітыкі адзначаюць: дакрэдытавацца цяпер могуць сем'і з сярэднімі для Мінска заробкамі. Напрыклад, каб атрымаць суму ў 59 тысяч рублёў (каля 30 тысяч долараў), сукупны даход крэдытаатрымальніка павінен складаць 1200 рублёў у месяц. Сярэдняя выплата штомесяц пры тэрміне крэдытавання 20 гадоў складае 730 рублёў (каля 375 долараў), у той час як сярэдняя арэндная плата за «двушку» складае каля 500 рублёў (260 долараў). Толькі ў адрозненне ад арэнды пры пагашэнні крэдыту грошы не выцякаюць з сямейнага бюджэту ў нікуды, а ідуць непасрэдна на куплю кватэры.

## ПАДРЫХТАВАЦЦА ЗАГАДЗЯ

На жаль, выраслі і колькасць сарваных здзелак, у якіх пакупнікі разлічвалі на крэдыт. З-за таго, што пакупнікі не заўсёды адэкватна ацэньваюць сваю плацежаздольнасць, вялікая колькасць папярэдніх дагавораў рассыпаецца, прадаўцы губляюць сродкі, час і нервы. Асабліва непрыемна, калі такія сітуацыі ўзнікаюць у ланцужках.

Да куплі кватэры ў крэдыт варта падрыхтавацца. Перш чым заключаць папярэдні дагавор і нават раней, чым вывучаць рынак з мэтай куплі, эксперты раяць кожнаму пакупніку не паленавацца і звярнуцца па кансультацыю ў некалькі банкаў не па тэлефоне, а асабіста, каб выбраць найбольш аптымальныя для сябе ўмовы крэдытавання. Трэба разумець, што ні адзін банк сёння не крэдытуе 100% кошту жылля. Неабходна мець уласныя сродкі, каля 30—40%.

Супрацоўнікі банка пралічаць даступную суму, пакажуць працэнт і тэрмін крэдытавання. Вы можаце выбраць найбольш прымальны для вас варыянт. Неабходна паклапаціцца і пра паручыцеля.

Была сітуацыя, калі банк тройчы адмаўляў у крэдыце пакупніку кватэры, бо не падыходзілі паручыцелі. Калі вы як патэнцыйны пакупнік будзеце валодаць дакладнай інфармацыяй аб сваёй плацежаздольнасці, тады прасцей будзе падбіраць адпаведную кватэру і спакойна заключаць папярэдні дагавор. Як растлумачылі спецыялісты аднаго з банкаў, якія крэдытуюць набыццё нерухомасці, часта людзі мяркуюць аб сваёй плацежаздольнасці наўгад, па крэдытным калькулятары. Банк жа пры асабістым звароце ўлічвае шмат нюансаў:

— даходы сям'і і яе штомесячныя выдаткі;

— наяўнасць непагашаных крэдытаў і крэдытную гісторыю;

— узрост крэдытаатрымальнікаў (людзям, старэйшым за 55 гадоў, некаторыя банкі адмаўляюць у крэдыце);

— бесперапыннасць стажу. Частка банкаў не дае крэдыт на падставе таго, што чалавек на працягу апошніх 6 месяцаў змяніў работу;

— даходы паручыцеляў і іх узрост (напрыклад, у паручыцелі не ўсе банкі бяруць сваякоў, старэйшых за 55 гадоў).

Практычна ўсе банкі патрабуюць двух паручыцеляў — сярэдняга ўзросту, з добрай зарплатай. А знайсці такіх няпроста. Акрамя пералічаных, у банкаў ёсць і іншыя нюансы. Так што рыэлтары не хітруюць, калі кажуць, што маё сэнс спачатку асабіста пракансультавацца ў спецыялістаў банка, а потым ужо меркаваць, на які крэдыт рэальна можна разлічваць.

Стаўкі па крэдытах на будаўніцтва і куплю нерухомасці цяпер стартуюць ад 11,5% гадавых. Такую стаўку, у прыватнасці, прапануе Беларусбанк на першыя два гады крэдытавання. Далей стаўка будзе раўняцца стаўцы рэфінансавання Нацбанка плюс 3 працэнтныя пункты (калі нічога не зменіцца, будзе 14,5%). Яшчэ некалькі банкаў крэдытуе набыццё нерухомасці пад 11—14,5% гадавых — у залежнасці ад тыпу нерухомасці.

## ЦЭНЫ СТАЯЦЬ

Што датычыцца ўзроўню цэн, то, нягледзячы на актыўнасць пакупнікоў, яны працягваюць заставацца на ранейшым узроўні і разлічваць на іх рост у найбліжэйшы час не варта. Аналітыкі тлумачаць: крэдыты выступаюць не актыватарам рынку, а хутчэй яго выратавальным кругам, які дазваляе кампенсаваць недахоп даходаў насельніцтва для набыцця кватэры, і тым самым падтрымліваць попыт на стабільным узроўні. Гэта значыць, цэны на кватэры і фінансавыя магчымасці пакупнікоў цяпер знаходзяцца ў парытэце. А выбар у пакупнікоў прадугледжвае заставацца вельмі шырокім — практычна 7 тысяч кватэр, што для Мінска з'яўляецца высокім паказчыкам.

Сёння сярэдняя цана квадратнага метра аднапакаёвых кватэр сталіцы на другасным рынку жылля складае 1080 долараў, двухпакаёвых кватэр — 1010 долараў, трохпакаёвых — 960 долараў. Згодна з інфармацыяй здзелак, кошт стандартных аднапакаёвак будзе каля 37 тысяч долараў, двухпакаёвак — 51 тысяча, а трохпакаёвак — 65 тысяч долараў.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Дыпламатычнае інтэрв'ю

## Конрад ПАЎЛІК:

# «Мы павінны ганарыцца тым, што нашы народы маюць такую багатую агульную спадчыну, а іх культура і гісторыя пераплятаюцца»

**Дыпламатычным стасункам Беларусі з Польшчай сёлета споўнілася дваццаць пяць гадоў. За чвэрць стагоддзя ў адносінах з суседняй краінай было ўсякае: ад напружанасці да пацяплення. Але сёння можна сказаць з упэўненасцю, што нават з нашым супярэчлівым гістарычным бэкграўндам сучаснасць мы імкнёмся будаваць па законах добрасуседства і ўзаемадзеяння. Пра надзённае — агульныя праекты, інвестыцыі і «чый Адам Міцкевіч?» — мы пагаварылі з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Польшчы ў Беларусі Конрадам ПАЎЛІКАМ.**

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**— Спадар Пасол, адносіны паміж сучаснымі Беларуссю і Польшчай будуюцца на складаным і супярэчлівым гістарычным падмурку, што натуральна. Доўгі час палітычны дыялог паміж нашымі краінамі з розных прычын быў замарожаны, але апошнім часам актывізаваўся. На што ў гэтым дыялогу найперш робіцца стаўка?**

— Апошнія паўтара года мы спрабуем нагнаць час, які мы не заўсёды былі ў стане выкарыстаць эфектыўна. Акрамя асабістых і эканамічных кантактаў, якія паміж нашымі краінамі заўсёды былі дастаткова актыўнымі, мы адбудоўваем супрацоўніцтва паміж асобнымі ведамствамі, дапрацоўваем дагаворна-прававую базу, шукаем новыя, карысныя для нашых краін праекты, такія, напрыклад, як супрацоўніцтва ў рамках кітайскай ініцыятывы «Адзін пояс, адзін шлях». Дынамічна развіваецца трансгранічнае супрацоўніцтва, яскравым прыкладам чаго з'яўляецца сумеснае прасоўванне маркі Аўгустоўскага канала і заахвочванне турыстаў, у тым ліку з іншых краін, да яго наведвання. Такіх праектаў нямала і можа быць яшчэ больш. Я рады, што працэс актывізацыі нашага супрацоўніцтва супаў з 25-годдзем усталявання дыпламатычных адносін паміж Польшчай і Беларуссю. Польшча з'яўляецца членам Еўрапейскага саюза і НАТА, а Беларусь утварае з Расіяй Саюзную дзяржаву і з'яўляецца членам АДКБ, але мы суседзі і можам узаемадзейнічаць на прынцыпах добрасуседства ва ўсіх магчымых галінах, аб чым сведчыць дагавор, падпісаны паміж нашымі краінамі чвэрць стагоддзя таму.

**«На працягу апошніх двух гадоў растуць тавараабарот паміж нашымі краінамі і аб'ём польскіх інвестыцый у Беларусі».**

**— Цяпер дыялог паміж Польшчай і Беларуссю вядзецца на ўзроўні ўрадаў і парламентаў. Чаго атрымалася дасягнуць з моманту актывізацыі кантактавання?**

— Мы бліжэй знаёмімся і лепш разумеем свае аргументы. Мы таксама будуем давер, заўсёды патрэбны ў дыпламатыі і асабліва паміж суседзямі. На працягу апошніх двух гадоў расце тавараабарот паміж нашымі краінамі і аб'ём польскіх інвестыцый у Беларусі. У нас увесь час ёсць значны патэнцыял для развіцця, і мы ідзём у правільным напрамку. Трэба проста далей ісці гэтай дарогай.

**— Сярод краін Еўрапейскага саюза Польшча і без таго з'яўлялася адным з нашых асноўных эканамічных партнёраў. Наколькі і за кошт чаго сітуацыя з тавараабаротам і інвеставаннем за апошнія два гады палепшылася?**

— Польскія кампаніі зацікаўлены інвеставаннем у Беларусі. Я маю на ўвазе як малы і сярэдні бізнес, так і сур'ёзных гульцоў. Бізнес, як і дыпламатыя, любіць цішыню, але за паўтара года маёй дыпламатычнай місіі я прымаў удзел у адкрыцці некалькіх праектаў, якімі мы можам ганарыцца і якія прыносяць карысць абедзвюм дзяржавам. У маі разам з прадстаўнікамі мясцовых улад я прымаў удзел у адкрыцці прадпрыемства кампаніі «Modern-Expo» ў Віцебску, якая займаецца вытворчасцю гандлёвага абсталявання. Гэта міжнародны гулец у згаданай галіне, які супрацоўнічае з вялікімі гандлёвымі сеткамі як на ўсходзе, так і на захадзе. Інвестыцыя ўжо зараз дае некалькі соцень месцаў працы, а плануецца яе развіццё. Нашы нацыянальныя авіялініі «ЛОТ» і «Белавія» павялічваюць колькасць рэйсаў паміж Варшавай і Мінскам, працуюць над запускам новых напрамкаў. Перад летнімі адпачынкамі на працягу некалькіх месяцаў эксперты Варшаўскай фондавай біржы праводзілі ў Мінску навучальныя курсы па рынку каштоўных папер для прадстаўнікоў некалькіх дзясяткаў устаноў і кампаній. Наша будучая кампанія «UNIBEP» рэалізуе чарговы вялікі праект у Беларусі — будуе лагістычны цэнтр у Балбасаве. Магчыма, пра гэта трэба больш гаварыць, што таксама роля СМІ. У галіне інвестыцый нам патрэбны гісторыі поспеху, якія заахвоцяць чарговых інвестараў.

**— Адным з далікатных момантаў у адносінах паміж нашымі краінамі называюць Саюз палякаў у Беларусі. Што сёння адбываецца ў гэтай дыскусіі?**

— Сёння ў Беларусі існуюць два саюзы палякаў. Мы прытрымліваемся пазіцыі легалізацыі саюза, які прызнае Варшава. Гэта пытанне невырашана. Але я думаю, яно выклікае менш супярэчнасцяў, чым у папярэднія гады, хоць і патрабуе прыняцця смелага рашэння. Галоўнае, каб кожны чалавек польскага паходжання ў Беларусі адчуваў сябе камфортна і меў магчымасць гэта свабодна дэманстраваць і развіваць, канечне, з поўнай павагай да таго факта, што ён грамадзянін Беларусі. У нас такі ж падыход да асоб беларускай нацыянальнасці, якія жывуць у Польшчы і з'яўляюцца грамадзянамі нашай краіны.

**— Большасць польскіх беларусаў жыве ў Падляскім ваяводстве — як на гэтай тэрыторыі сябе пачуваюць людзі, што хочуць вывучаць, размаўляць і чытаць на беларускай мове. Якія ўмовы стварыў польскі ўрад для таго, каб беларусы тут адчувалі сябе беларусамі?**

— Мы адносімся да польскіх беларусаў як да нашага багацця і часткі спадчыны гэтых зямель. Падляшша заўсёды было шматкультурным і шматрэлігійным рэгіёнам, як і значная частка Беларусі. Польскія беларусы (зрэшты, не толькі тыя, што жывуць на Падляшшы) маюць поўную свабоду ажыццяўлення дзейнасці, звязанай з іх нацыянальнай самасвядомасцю, рэгістрацыі рознага тыпу арганізацый, яны выдаюць уласныя газеты, у іх ёсць рэгіянальнае радыё на беларускай мове і праграмы, прысвечаныя нацыянальнай меншасці, на мясцовым тэлебачанні. У іх ёсць таксама доступ да СМІ з тэрыторыі самой Беларусі, у тым ліку галоўных тэлеканалаў. Дзейнічаюць дзве сярэднія школы з паглыбленай праграмай вывучэння беларускай мовы, а таксама шмат устаноў, дзе можна вывучаць беларускую мову на пачатковым узроўні. Адкрыццё такіх класаў залежыць выключна ад ініцыятывы саміх вучняў і іх бацькоў. З новага навучальнага года вывучаць беларускую мову можна таксама ў Варшаве, у адной са школ і дзіцячым садку, бо з такой ініцыятывай выступілі бацькі вучняў. Ніхто не перашкаджаў, а працэдура заняла ўсяго некалькі месяцаў.

**— Некалькі месяцаў таму ў СМІ з'явілася навіна пра тое, як трох маладых людзей з Беларусі збілі каля варшаўскага клуба «Макулатура» з абразамі паводле нацыянальнай прыкметы. Яшчэ адно здарэнне адбылося ў сеткавай краме, супрацоўнік якой дэманстратыўна адмовіўся абслугоўваць дзяўчыну, калі даведаўся, што яна з Беларусі. Стала вядома таксама аб актах вандалізму ў дачыненні да беларускамоўных дарожных знакаў у Падляскім ваяводстве. Вядома ж, па гэтых прыкладах нельга ацэньваць настроі грамадства ў цэлым, але як вам бачыцца гэтая сітуацыя?**

З мэтай прафілактыкі захворванняў часнаку апрацуйце зямлю 1-працэнтным растворам меднага купарвасу (1 ст. л. рэчыва развесці ў 10 л вады). Атрыманым растворам пры дапамозе палівачкі праліце ўсю плошчу градкі. Затым прыкрыйце яе плёнкай.

У сярэднім на 2 кв. м спатрэбіцца 1 вядро такога раствору.

Напярэдадні высадкі часнаку раскідайце на паверхні градкі мачавіну з разліку 10—20 г на кв. м і паліце глебу вадой.

### Падрыхтоўка часнаку

Разабраць галоўкі часнаку на асобныя зубчыкі, з якіх трэба адабраць для пасадкі самыя буйныя, здаровыя. Іх неабходна на суткі замачыць у 0,1-працэнтным растворы перманганату калію або 1-працэнтным растворы меднага купарвасу.

Пасля гэтых працэдур часнок можна лічыць гатовым да пасадкі.

На падрыхтаваны загадзя градцы вызначаем месца пасадкі. Для гэтага палкай робім у зямлі лункі на адлегласці 10 см адна ад адной. Глыбіня лункі — ад 3 да 15 см у залежнасці ад метаду і часу пасадкі. Адлегласць паміж радамі — 20—25 см.

У лункі раскладваем зубчыкі часнаку. Уціскаць іх у зямлю не варта, бо гэта затрымлівае коранеўтварэнне. Засыпаць лункі неабходна перапрэлым кампостам.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.17 | 18.38 | 11.21 |
| Віцебск — | 7.08 | 18.27 | 11.19 |
| Магілёў — | 7.07 | 18.28 | 11.21 |
| Гомель — | 7.02 | 18.26 | 11.24 |
| Гродна — | 7.32 | 18.54 | 11.22 |
| Брэст — | 7.32 | 18.56 | 11.24 |

### Месяц

*Поўня 5 кастрычніка.*
*Месяц у сузор'і Авена.*

### Імяніны

***Пр.*** *Аляксандра, Аляксея, Андрэя, Валянціна, Васіля, Данілы, Івана, Іосіфа, Ісака, Кандрата, Канстанціна, Уладзіміра.*
***К.*** *Разаліі, Ружы, Конрада, Францішка.*

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

— Тата, а чаму ў нас няма машыны?

— Таму што, сынок, маме ў футры цяплей.

**Ёсць шмат мужчынскіх захапленняў — футбол, рыбалка, лазня...**

**І чым далей ад жонкі, тым менш усё гэта падобна на футбол, рыбалку і лазню.**

**Муж:**

**— Не, сёння лянота.**

**Жонка:**

**— Ну, тады ідзі паеш.**

**Муж:**

**— Вось заўжды б так, калі не хочаш смецце выкідаць, альтэрнатыва — паесці!**

**Цешча:**

**— Ну, смецце ж трэба некуды дзяваць...**

— Як добра вы атрымаліся на вашых вясельных фотаздымках!

— А то ж! Адзін макіяж нявесты абышоўся ў 500 долараў!

— А твой колькі каштаваў?

— А я проста галаву памыў...

**Жонка — мужу:**

**— Дарагі, выкінь смецце.**

carikatura.ru

## Даты Падзеі Людзі

### 4 КАСТРЫЧНІКА

**1582** год — 435 гадоў таму ў адпаведнасці з указам папы рымскага Рыгора XIII у каталіцкіх дзяржавах праведзена рэформа юліянскага календара, які быў уведзены з 1 студзеня 45 года да нашай эры ў выніку рэформы, ажыццёўленай у 46 годзе да нашай эры Юліем Цэзарам, быў уведзены новы (грыгарыянскі) каляндар. Разам з іншымі дзяржавамі на гэты каляндар перайшла Рэч Паспалітая (у Савецкай Расіі гэты стыль уведзены 31 студзеня 1918 года).

**1800** год — нарадзіўся (Магілёўская губерня) Іван Іванавіч Гарбачэўскі, рэвалюцыянер-дзекабрыст. Дзяцінства і юнацтва прайшлі ў Віцебску. Скончыў Віцебскую гімназію, затым выхоўваўся ў Дваранскім палку (афіцэрскай школе пры 2-м кадэцкім корпусе ў Пецярбургу). З 1820 года ў чыне прапаршчыка служыў у 8-й артылерыйскай брыгадзе ва Украіне. Вёў прапаганду і агітацыю сярод салдат і афіцэраў, быў прыхільнікам знішчэння царскай сям'і. Падчас паўстання Чарнігаўскага пяхотнага палка (1825) спрабаваў падняць суседнія воінскія часці. У студзені 1826-га арыштаваны і асуджаны да смяротнага пакарання, якое было заменена катаргай з пазбаўленнем дваранскага тытула. У ссылцы вёў рэвалюцыйную прапаганду сярод мясцовага насельніцтва, зблізіўся з ссыльнымі рабочымі, знаёміў іх з выданнямі А. І. Герцэна — «Полярной звездой» і «Колоколом». Пасля катаргі жыў на пасяленні ў Чыцінскай вобласці. Аўтар мемуараў, прысвечаных руху дзекабрыстаў. Памёр у 1869 годзе.

**1928** год — нарадзіўся (в. Бронніца Буда-Кашалёўскага раёна) Аляксей Сцяпанавіч Кейзараў, беларускі пісьменнік, нарысіст. Працаваў настаўнікам, у рэдакцыях газет, на Беларускім радыё, у 1974—1988 гадах — у часопісе «Нёман». Аўтар кніг «Нас было сямёра», «Ля ціхай Серабранкі», «Дальва — сястра Хатыні», аповесці «Рэха на Палессі», твораў для дзяцей. Памёр у 1994 годзе.

**1957** год — у СССР з касмадрома Байканур запушчаны першы ў гісторыі планеты штучны спадарожнік Зямлі. Пачатак эры асваення касмічнай прасторы.

### Было сказана

**Канстанцыя БУЙЛО, паэтэса:**

*«Не, ты не вечны, чалавек!*
*І у цябе нямнога часу.*
*Дык думак добрыя запасы*
*У доўгі не кладзі засек».*

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звязде», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ тэл./факс: 287 17 79,
РЭКЛАМЫ e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 3663.

Нумар падпісаны ў 19.30 3 кастрычніка 2017 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

# Мясцовае самакіраванне

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

4 кастрычніка 2017 г. №37 (421)

стар. 2

**Рамонт адзення... за рубель**

стар. 5

**«Адкасіць» ад... калгаса**

стар. 8

**«Усе пытанні — мае»**

ТЭМА НУМАРА

# ДОБРА ТАМ, ДЗЕ... МЫ ЁСЦЬ?

## Як затрымаць маладых спецыялістаў у глыбінцы

Фота Надзеі БУКАН.

Хлебазавод №1, г. Мінск.

**ПРА тое, што рэгіёнам патрэбны кваліфікаваныя кадры, чуем рэгулярна. Але многія вакантныя месцы ў правінцыі так і застаюцца незапоўненымі, а выпускнікі ўніверсітэтаў і каледжаў імкнуцца ў сталіцу і буйныя абласныя гарады. Чым могуць прывабіць моладзь мясцовыя прадпрыемствы? Якія ўмовы могуць стварыць для спецыялістаў, каб тыя не збеглі пасля заканчэння тэрміну адпрацоўкі? Разбіраемся разам з экспертамі.**

стар. 4

УЛАДА Ў АСОБАХ

# «МАЯ ДУША ЛЯЖЫЦЬ ДА КУЛЬТУРЫ»

## Галоўны ідэолаг Любаншчыны — пра любоў да Бацькаўшчыны, творчыя крылы і каханне

**З Любанскім раёнам нашу газету звязвае даўняе сяброўства. Усё пачалося яшчэ ў далёкім 1933 годзе, калі Янка Купала прыехаў на Любаншчыну пісаць сваю знакамітую паэму «Над ракой Арэсай» — урывак з яе ўпершыню быў надрукаваны менавіта ў «Звяздзе». У гады ж Вялікай Айчыннай вайны край балот стаў прытулкам не толькі для партызанаў. На легендарным востраве Зыслаў, які называлі «другой Масквой», працягвала выдавацца (пасля трагічных падзей у акупаваным Мінску) падпольная «Звязда».**

Дагэтуль тут шануюць памяць нашых папярэднікаў, а «Звязда» па праве лічыцца роднай газетай. І ў гэтым вялікая заслуга адданага падпісчыка газеты з 30-гадовым стажам, **начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Любанскага райвыканкама Васіля КАТКАЎЦА**. Сёння ён — госць «Мясцовага самакіравання».

**— Васіль Сцяпанавіч, адна песня, якую неяк давялося пачуць у вашым выкананні, што называецца, зачапіла за жывое. У ёй пяецца аб тым, што ў кожнага з нас — свой Бог у душы. Вы чалавек веруючы?**

— Магчыма, я не так духоўна адданы Богу, як хацелася б. Але веру ў спрадвечныя традыцыі справядлівасці, дабра, міласэрнасці, любові да бліжняга, да Бацькаўшчыны. Па характары я шчыры, талерантны беларус, які любіць сваё, шануе чужое. Гэтых прынцыпаў прытрымліваюся і на працы як кіраўнік аддзела. Хаджу і ў царкву. З задавальненнем далучаюся да многіх царкоўных абрадаў.

**— Адкуль такая адданасць свайму, беларускаму?**

— Відаць, усе вытокі — у той мясцовасці, дзе я нарадзіўся. А адбылося гэта ў глыбінцы беларускага Палесся, у вёсцы Тышкавічы Іванаўскага раёна. Гэта ўнікальны край, які захаваў палескую гаворку, народныя традыцыі. Нават у тыя складаныя савецкія часы мы заўсёды святкавалі Купалле, Вялікдзень, Каляды. Помню, як усёй грамадой у гонар Казанскай Божай Маці будавалі царкву. Вёска лічыць яе сваёй апякункай, бо, на думку жыхароў, менавіта гэтая ікона ў гады Вялікай Айчыннай вайны зберагла яе ад знішчэння. Замест усяго насельніцтва расстралялі 12 мірных жыхароў. За тое, што ў вёсцы забілі двух немцаў...

стар. 3

Васіль Сцяпанавіч *(злева)* не толькі арганізоўвае мерапрыемствы, а і прымае ў іх самы актыўны ўдзел.

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

## ЗАГАДАНА АЗДАРАВІЦЬ

*Да вырашэння праблем у АПК неабходна прыцягваць прыватнікаў*

Фота БЕЛТА.

Такое меркаванне **Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі і ўпаўнаважаны Прэзідэнта па Брэсцкай вобласці**, выказаў на пасяджэнні Брэсцкага аблвыканкама. У вобласці адзначаюць больш за 60 праблемных сельскагаспадарчых арганізацый, якія павінны самастойна выйсці на прыбытак па бізнес-планах або планах санацыі, якія былі распрацаваны. Праблемы яшчэ 15 прадпрыемстваў плануецца вырашыць за кошт інтэграцыі з іншымі. Менавіта таму галоўнай тэмай пасяджэння стала рэалізацыя Указа №253 «Аб мерах па фінансавым аздараўленні сельскагаспадарчых арганізацый».

«Па інтэгратарах. Трэба ўлічваць і іх меркаванне, інакш могуць паўстаць праблемы і ў іх. І трэба больш актыўна прыцягваць прыватныя структуры: як фізічных, так і юрыдычных асоб. Бо ёсць добры вопыт у тых жа Баранавіцкім, Лунінецкім раёнах. Трэба проста пашыраць гэтую практыку. Я мяркую, што рашэнні на месцах маглі б прымацца больш хуткімі тэмпамі. І ў адносна спрыяльны год вынікі маглі б быць лепшыя, калі б была канкрэтная работа», — адзначыў Міхаіл Мясніковіч.

Старшыня Савета Рэспублікі таксама падкрэсліў, што за хібы на рабоце павінны адказваць не толькі кіраўнікі, але і спецыялісты. Да таго ж Міхаіл Мясніковіч выказаў думку, што «вельмі шмат кадраў з дыпломамі сельскагаспадарчага профілю працуюць у іншых галінах эканомікі. Трэба з імі працаваць і прыцягваць у АПК».

## ТЭЛЕФАНУЕМ СЕНАТАРУ

*Прамую лінію і выязны прыём грамадзян правялі на Гродзеншчыне*

На мінулым тыдні **Уладзімір ПАНЦЮХОЎ, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах**, паўдзельнічаў у пасяджэнні Гродзенскага аблвыканкама. Асноўнай тэмай стала ўключэнне ў гаспадарчы абарот маёмасці, якая не выкарыстоўваецца ці выкарыстоўваецца неэфектыўна, і рэалізацыя Дырэктывы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 11 сакавіка 2004 г. №1 «Аб мерах па ўмацаванні грамадскай бяспекі і дысцыпліны».

Тымі ж днямі Уладзімір Панцюхоў правёў выязны прыём грамадзян і прамую тэлефонную лінію ў Шчучынскім райвыканкаме. Восем чалавек звярнуліся да старшыні камісіі. Пытанні датычыліся выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў, занятасці, пенсійнага забеспячэння, зніжэння цэн на лекі, добраўпарадкавання дарог, якасці пітной вады, выдзялення зямельных участкаў для будаўніцтва, выканання сацыяльных стандартаў у аграгарадках. Акрамя гэтага, член Савета Рэспублікі сустрэўся з працоўнымі калектывамі і кіраўніцтвам Шчучынскага масласырзавода і ААТ «Праймілк».

## КАЛЕКТЫЎНЫ ЗВАРОТ

*Члены Савета Рэспублікі працуюць у раёнах*

**Галіна ТРЫБУНАХ, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, дырэктар ААТ «Зорка»**, правяла выязны прыём грамадзян на тэрыторыі Палескага сельсавета Чачэрскага раёна. Да сенатара паступіў калектыўны зварот ад жыхароў населеных пунктаў Гацкае і Усошнае наконт арапцоўкі прысядзібных участкаў, набыцця і дастаўкі арганічных угнаенняў. Пытанне было вырашана станоўча.

Акрамя таго, Галіна Трыбунах паўдзельнічала ў пасяджэнні трыццаць сёмай сесіі Рагачоўскага раённага Савета дэпутатаў 27-га склікання. Галоўнымі пытаннямі сталі функцыянаванне сістэмы абыходжання з камунальнымі адходамі і паўторнае выкарыстанне матэрыялаў на тэрыторыі Рагачоўскага раёна. На прамую лінію да члена Савета Рэспублікі тэлефанавалі з пытаннямі аб працаўладкаванні, вулічным асвятленні і інш.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

# І ЗА РУБЕЛЬ... РАМОНТ АДЗЕННЯ

У Віцебскай вобласці напрацоўваюць вопыт адаптацыі людзей з абмежаванымі магчымасцямі

**У прыватнасці, дапамагаюць аднавіць страчаныя ў выніку цяжкай хваробы прафесійныя навыкі, атрымаць новую спецыяльнасць. У той жа час паслугі, якія аказваюць людзі з інваліднасцю, прыемна ўражваюць спажыўцоў прывабным коштам. Ну дзе яшчэ адрамантуюць штаны за 1 рубель? Ці зробяць візіткі добрай якасці па цане ў тры разы танней, чым у звычайных капіравальных цэнтрах?**

У майстэрнях цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Першамайскага раёна Віцебска.

Наш карэспандэнт пабываў у Тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Першамайскага раёна горада Віцебска. Паводле слоў **дырэктара Вольгі ГУРЧАНКІ**, установа абслугоўвае самы густанаселены раён горада. Сёлета ў рамках спецыяльнай праграмы тут уладкавалі на працу больш за 10 чалавек, якія аказваюць насельніцтву розныя віды паслуг.

**Загадчыца аддзялення дзённага знаходжання інвалідаў згаданага цэнтра Яна ШЛЯХТО** здзівіла расцэнкамі.

— У нашай установе можна рабіць заказы, напрыклад, на рамонт адзення, прычым, дробны рамонт каштуе 1 рубель. Пры гэтым якасць выкананага будзе не горшая, чым у звычайных майстэрнях, бо кантралюе працэс вопытны настаўнік. Нядорага каштуюць візіторкі — пры гэтым вам распрацуюць і іх знешні выгляд. Заказчыкі здзіўляліся, што ў канкурэнтаў аналагічныя паслугі як мінімум у два разы даражэй, — расказвае Яна.

Танныя паслугі — вынік дапамогі дзяржавы ў рэалізацыі праграм падтрымкі, стварэнні працоўных месцаў для тых, хто атрымаў інваліднасць.

У цэнтры на працягу шасці месяцаў — года падапечныя праходзяць рэабілітацыю. Нярэдка яны сталі інвалідамі раптоўна — у выніку ДТЗ, інсультаў, і раней не скардзіліся на здароўе. Быў выпадак, калі з аднаго хлопца была знятая інваліднасць. За час працы ў цэнтры стан яго здароўя палепшыўся.

Падчас трэнінгу людзей вучаць правільна шукаць месца работы і прапаноўваць свае магчымасці. Найбольш цяжка зрабіць гэта, як ні дзіўна, людзям з вышэйшай адукацыяй. Напрыклад, адна з падапечных цэнтра раней выкладала ў школе. Перадпенсійны ўзрост і другая група інваліднасці — не найлепшыя якасці патэнцыйнага кандыдата. Але жанчыне стараюцца дапамагчы.

Людзі з абмежаванымі магчымасцямі ў цэнтры вядуць заняткі ў гуртках па вывучэнні замежных моў, навыкаў выкарыстання камп'ютарных тэхналогій, аматараў кіно і іншых.

Мы ўжо не раз пісалі пра тое, што на Віцебшчыне ўвогуле наладжаны высокі ўзровень сацыяльнага абслугоўвання, а многія кірункі дзейнасці потым становяцца прыкладам для пераймання.

Нядаўна ў СМІ анансавалі комплексную паслугу па доглядзе за пажылымі. Як растлумачыла **начальнік упраўлення сацыяльнай падтрымкі насельніцтва і стацыянарных устаноў камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне аблвыканкама Вера АСТАПЕНКА**, догляд, у прыватнасці, аказваецца людзям з вялікімі праблемамі са здароўем. У прыватнасці, пасля інсульту. Такім людзям дапамогуць як па месцы пражывання, так і ў аддзяленні дзённага знаходжання.

Часта праводзяцца інтэграцыйныя форумы, тэматычныя культурныя акцыі. У прыватнасці, нядаўна шосты раз адбыўся фестываль-конкурс «Сонечнае свята для ўсіх».

Асабліва ўважліва вывучаюцца скаргі людзей з інваліднасцю на прамых лініях — кожны такі сігнал бярэцца на заметку.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

УСЁ Ў ПАРАДКУ

# «Наша задача — здымаць праблемныя пытанні»

**Любчанскі сельвыканкам — самы буйны ў Навагрудскім раёне. Акрамя гарадскога пасёлка Любча, ён аб'ядноўвае больш як два дзясяткі іншых населеных пунктаў, у якіх пражывае каля 2,8 тысячы жыхароў.**

— З пачатку года да нас паступіла 16 зваротаў грамадзян, большасць з якіх датычыліся пытанняў функцыянавання сістэмы жыллёва-камунальнай гаспадаркі, добраўпарадкавання, асабістага камфорту мясцовых жыхароў. Вядома, значна больш пытанняў і праблем вырашаецца падчас асабістых штодзённых зносінаў з людзьмі. Гэта адзін з асноўных кірункаў работы, — упэўнены **Іван Ярмац, старшыня Любчанскага сельвыканкама Навагрудскага раёна.**

Паводле яго слоў, сёння адна з актуальных праблем — небяспечныя дрэвы. Не рэдкія звароты грамадзян, якія просяць спілаваць іх на могілках.

— Гэтаму пытанню ўдзяляем вялікую ўвагу на працягу апошніх гадоў. З пачатку гэтага года спілавана больш за 200 старых дрэў. Асноўная частка — на могілках вёскі Вераскава: з гэтага населенага пункта паступіў калектыўны зварот грамадзян, — адзначыў Іван Ярмац. Ён падкрэсліў, што на могілках, а іх на тэрыторыі сельсавета больш за дзясятак, за апошнія пяць гадоў убрана больш як дзве тысячы небяспечных дрэў.

Вуліцу Леніна ў Любчы прывялі ў поўны парадак: тут пракладзены водаправод і газапровад, праезная частка заасфальтавана. Аднак адно пытанне заставалася нявырашаным. У сельвыканкам звярнулася мясцовая жыхарка Любоў Путрыч. Яна паскардзілася, што яе падворак падчас моцных ліўняў падтапляецца. Сумесна з раённай ЖКГ праблема была знятая: цяпер дажджавыя воды адводзіць новая адкрытая ліўнёўка.

— Добраўпарадкаванню, стварэнню камфортных умоў для жыцця людзей з боку сельвыканкама, а таксама раённага выканаўчага камітэта ўдзяляецца павышаная ўвага. У прыватнасці, па зваротах грамадзян вырашана пытанне з будаўніцтвам пешаходнай дарожкі па вуліцы 1 Мая. Тут актыўны рух тэхнікі, а побач некалькі «цэнтраў прыцягнення» пешаходаў, у тым ліку і школа, таму гэта пытанне не толькі камфорту, але і бяспекі, — адзначыў Іван Ярмац. Ён падкрэсліў, што ў планах — працяг будаўніцтва тратуараў і пешаходных дарожак, абнаўленне пакрыцця на некаторых вуліцах. Акрамя таго, у Любчы за апошнія гады поўнасцю абноўлена сістэма вулічнага асвятлення: усе ліхтары заменены на святлодыёдныя. Што важна, акрамя павышэння ўзроўню асветленасці, гэта дало важкі эканамічны эфект: расход электраэнергіі скараціўся больш чым у два разы. Усе вуліцы ў Любчы газафікаваны, падключаны да цэнтральнага водазабеспячэння, працуе ў гарпасёлку і станцыя абязжалезвання вады.

«Удзяляем увагу і іншым населеным пунктам. Нядаўна быў капітальна адрамантаваны ўчастак дарогі Любча—Бор. Ёсць аналагічныя планы па іншых напрамках», — адзначыў старшыня сельвыканкама. Ёсць тут і станоўчы прыклад вырашэння пытання з забеспячэннем мясцовых жыхароў палівам. На тэрыторыі сельсавета сёння налічваецца звыш 130 адзінокіх і больш за 500 адзінока пражываючых пенсіянераў. Ім цяпер няма патрэбы ехаць 25 км у гарпаліва ў Навагрудак і траціць сур'ёзныя грошы за дастаўку дроў. Часовая пляцоўка для захоўвання паліва створана ў Любчы: сельвыканкам збірае заяўкі ад насельніцтва, лясніцтва нарыхтоўвае неабходную колькасць драўніны, спецыялісты гарпаліва распілоўваюць, колюць дровы і аператыўна дастаўляюць заказчыку.

«Праблемныя пытанні будуць узнікаць пастаянна, наша ж задача — як мага хутчэй іх здымаць. Усе планы па развіцці населеных пунктаў, рамонце або рэканструкцыі дарог будуюцца, зыходзячы з меркавання нашых жыхароў. Галоўнае тут — іх камфорт і бяспека», — адзначыў Іван Ярмац. Ён падкрэсліў, што для станоўчага вырашэння пытанняў неабходная зладжаная работа ўсіх галін улады, а таксама кіраўнікоў прадпрыемстваў і арганізацый рознага ўзроўню.

**Па матэрыялах БЕЛТА.**

# «МАЯ ДУША ЛЯЖЫЦЬ ДА КУЛЬТУРЫ»

З жонкай Алай Валянцінаўнай разам і ў жыцці, і ў творчасці.

Фота з уласнага архіва Васіля КАТКАЎЦА.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й «МС».)*

**— Трагічны лёс не абмінуў і вашу вёску...**

— Як і большасць нашых населеных пунктаў, яна была вёскай-партызанкай. Для Іваначшчыны Тышкавічы — уласныя «людзі на балоце». Ясельда і той мост адразалі вёску і фактычна рабілі яе недаступнай для іншых. Гэта вядомыя Спораўскія балоты з аднаго боку, Мотальскія — з другога. Увогуле, гэта вёска-працаўніца. І прозвішча Каткавец там на слыху. Колішні намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Надзея Мікалаеўна з'яўляецца мне далёкай сваячкай. Жыве ў Тышкавічах унікальны фермер Таццяна Каткавец, якая вырошчвае найлепшыя цюльпаны ў Беларусі. Адзін з землякоў, гляджу, дзіду кідае: чэмпіён Еўропы сярод юніёраў. Адным словам, багатая на таленты вёска. Дарэчы, большасць мясцовых жыхароў не спяшаецца адтуль з'язджаць: імкнецца працаваць і жыць на Бацькаўшчыне. Сёння гэта аграгарадок. Там і музычная школа, і адзін з найлепшых на Іваначшчыне Дом культуры, унікальнае возера Мульнае... А якая прырода! Заўсёды з задавальненнем сюды прыязджаю. Гэта месца, дзе я адпачываю душой.

**— Ці можаце назваць сваё дзяцінства шчаслівым?**

— Дзяцінства згадваецца як самы вясёлы час, у сям'і нас выхоўвалася чацвёра братоў, і мы заўсёды дапамагалі бацькам па гаспадарцы. А яна была вялікай: конь, карова, свінні, куры... Толькі так можна было вывжыць у палескай вёсцы. Мае бацькі былі простымі працаўнікамі. Бацька на цэлы тыдзень з'язджаў у балота, касіў траву, а мы потым згрэбалі, там жа начавалі — як у Івана Мележа, у начное хадзілі. Летам я заўсёды пасвіў кароў. І ўсю тую літаратуру, якую нам давалі на канікулы, я прачытваў на лузе. Таму мне было вельмі лёгка вучыцца. Знаходзілі час і на возера, рэчку, лес, хадзілі ў паходы. Уся прырода, якая нас акружала, давала магчымасць жыць у атмасферы вясковага асяроддзя.

**— І, відаць, натхніла на творчую прафесію...**

— Спалучэнне духоўнасці і народных традыцый заўсёды трымалі мяне на плаве. Мая душа ляжыць да культуры. Таму, што датычыцца прафесіі, у мяне нават сумненняў не было. Паступіў у Гродзенскае культурна-асветніцкае вучылішча, затым была служба ў войску, пасля скончыў Мінскі інстытут культуры. Нягледзячы на чырвоны дыплом, паехаў, як той Лабановіч, падымаць культуру ў Любанскі раён. З сям'ёй, з жонкай. Ужо фактычна 35 гадоў падымаем. У 1990 годзе мне падалося, што не хапае філалагічнай адукацыі, і я паступіў у педуніверсітэт, але з творчымі крыламі жыву ўсё жыццё.

**— Якой вас сустрэла Любаншчына?**

— Паколькі размеркаванне ішло па сямейным прынцыпе (а я ўжо год як быў жанаты), першапачаткова мяне накіравалі на радзіму Алы Валянцінаўны — у Барысаў. Але потым думаю: навошта ехаць, так бы мовіць, да цешчы пад пяту? І тут якраз трапіў на ўсесаюзны семінар, дзе «сваталі» тых, хто можа працаваць у глыбінцы. Нас запрасілі на Любаншчыну, і мы паехалі. Цудоўны Палац культуры! Толькі што пабудаваны: новы, светлы. Нам вельмі спадабалася гэтая мясцовасць, там і засталіся. Старшыня калгаса, Герой Сацыялістычнай Працы Кузьма Шаплыка літаральна праз паўгода даў нам кватэру. Мы вельмі арганічна ўпісаліся: я стаў мастацкім кіраўніком, жонка ўзначаліла тэатральны калектыў.

> Заробак быў маленькі, але ў той час калгасы даплачвалі па 30 рублёў работнікам культуры: разумелі, што культура — тая сфера, якая стварае атмасферу.

Я ніколькі не шкадую, што не застаўся ў сталіцы, у абласным цэнтры ці вялікім горадзе, хоць мая адукацыя давала такую магчымасць. Паехаў туды, куды ляцела душа. А па душы я як быў вясковы чалавек, так ім і застаўся.

**— Дзякуючы вам з жонкай у Любанскім раёне з'явіўся першы ўзорны тэатр...**

— Калі мы прыехалі на Любаншчыну, там не было ніводнага ўзорнага народнага калектыву. Неяк адразу вырашылі, што будзем займацца дзіцячым тэатрам. Сёлета «Летуценнікам» спаўняецца 30 гадоў. І я, як той летуценнік, жыву гэтымі ідэямі крылаў, палёту. Лічу, што трэба трывала стаяць на зямлі, але разам з тым высока лунаць у паветры, у сваіх творчых памкненнях і думках.

**— Вы стаялі і ля вытокаў шматлікіх фестываляў, якія сёння з'яўляюцца візітнай карткай Любаншчыны, ды і ўвогуле Мінскага рэгіёна.**

— Мы варыліся ў сваім саку, аднойчы стала сумна... У Салігорск з'ездзілі, у Мінск, Слуцк, сабралі тэатральныя калектывы і зладзілі фестываль, які назвалі «Чароўны куфэрак». Два такія фестывалі зрабілі на рэгіянальным узроўні, затым фестываль набыў статус абласнога. Прайшло іх ужо 11, удзельнічаюць тэатралы з Расіі, Літвы, Польшчы, Украіны... Гэта не чыста тэатральны праект. «Чароўны куфэрак» — фестываль сяброўства.

**— Вы і самі з задавальненнем раз-пораз «прымераеце» на сабе тую ці іншую ролю. Вельмі дзіўна бачыць чыноўніка ў тэатральным вобразе...**

— Што такое праца начальніка аддзела ідэалагічнай работы? Часам табе даводзіцца рабіць тое, што патрабуе пасада. У дзіцячым тэатры адкрываецца твая душа, шчырыя эмоцыі, уласнае жыццё. Не прыкрытае, натуральнае. Сёлета мы паказвалі п'есу Сяргея Кавалёва «Пясочны замак». Маленькая істота, Пясчанік, будуе пясочныя замкі. Пабудаваўшы, ён павінен сысці, але гэтым разам вырашыў даведацца, хто пасля жыве ў тых замках. І Пясчанік бачыць, што за ім ідзе зграя, якая іх разбурае. Праўда, фінал аптымістычны: Пясчанік, Вапнінка і Глінянік адраджаюць гэтыя замкі... Ідэя ў тым, што нам, нягледзячы ні на што, трэба будаваць. Няхай гэта не зразумеюць сёння, але потым абавязкова будзе творчы плён. У гэтым сэнсе тэатр дае магчымасць задумацца аб нечым вечным, дакрануцца да вытокаў, духоўнасці.

**— Са сваёй жонкай, Алай Валянцінаўнай, вы сапраўды як дзве паловы аднаго цэлага. Ці ўяўлялі сабе іншую спадарожніцу жыцця?**

— Яшчэ са школы я думаў, што яна... не павінна насіць акуляры. Але так сталася, што ўзяў жонку ў акулярах. Яна прыйшла да нас у інстытут культуры на трэцім курсе. Я акурат прыехаў з будатрада. Багаты чалавек! Мне трэба было набыць світар. А яна вязала. І мне настолькі спадабаўся створаны Алай світар, што яна не толькі мне яго прадала, а і прывязала да сябе. З Алай Валянцінаўнай мы ўжо 36 гадоў разам. Выхавалі сына і дачушку. Сын скончыў Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў, працуе кінавідэааператарам. Дачка вучылася ў Беларускім дзяржаўным універсітэце, па спецыяльнасці — культуролаг. Дзеці выраслі на сцэне, ігралі галоўныя ролі ў спектаклях, ездзілі з намі на гастролі, таму іх прафесійны выбар цалкам заканамерны.

**— Ваш дом — гэта месца адпачынку?**

— Дзесяць гадоў мы жылі ў аднапакаёвай кватэры на чацвёртым паверсе, а ў вёсцы так хацелася быць бліжэй да зямлі. Таму ўзяў крэдыт і пабудаваў дом. Як нафантазіравалі, так пабудавалі. Ён у нас невялічкі, але вельмі цёплы, утульны. Ёсць мансарда, пад ёй — вялікая бібліятэка. Агарод — 15 сотак. Мы не аматары сельскагаспадарчай дзейнасці, але маем градачкі, цяплічку. Жонка вельмі любіць кветкі. У нас такая традыцыя: раніцай п'ём каву ў альтанцы, абмяркоўваем планы, атрымліваем асалоду ад прыроды, надвор'я.

**— Падзяліцеся сакрэтам: як сёння, займаючы кіраўнічую пасаду, не страціць сувязі з людзьмі?**

— Скажу шчыра: сёння быць кіраўніком з чалавечым тварам вельмі-вельмі складана. Мяне выручае гумар. Калі ўсё ўспрымаць усур'ёз, будзе цяжка жыць. Я ўдзячны, што мяне акружаюць вельмі творчыя асобы. За 20 гадоў працы я стварыў кола паплечнікаў, якія мяне добра разумеюць. Калі мы працуем на пэўную ідэю, то робім гэта супольна. Разам мы падтрымліваем народныя традыцыі Любаншчыны, захоўваем фальклор. У нас ёсць клуб народнай кухні «Гаспадыня», дзе адраджаюць народныя традыцыі, свая хлебапякарня «Кулітка», Школа рамёстваў, дзе ўзнаўляем сем кірункаў: ад бондарства да саломапляцення. У нас тры калектывы маюць статус гісторыка-культурнай каштоўнасці. Мы зараз становімся ўнікальным праектам. Сёння ў раёне будуецца «Слаўкалій», і глабалізацыя можа нас паглынуць. У гэтым вірлівым хаўрусе трэба захаваць куточак сваёй Бацькаўшчыны.

> ***Днямі Васіль Каткавец адзначыў свой 60-гадовы юбілей. Калектыў рэдакцыі газеты «Звязда» зычыць Васілю Сцяпанавічу моцнага здароўя, дабрабыту, плёну, імпэту і натхнення! Няхай наша сяброўства працягваецца шмат гадоў!***

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*


**Извещение о проведении первых и повторных открытых торгов по продаже земельных участков в частную собственность. Организатор: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 47-20-56.**

Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка. Размер начальной цены и задатка

Лот №1. Земельный участок с кадастровым №220882719601000035, площадью 0,2088 га по адресу: Витебская обл., Браславский р-н, Друвеский с/с, д. Почта Ababье, участок №5 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (озеро Обабье), охранная зона особо охраняемых природных территорий (Национальный парк «Браславские озера»), охранная зона электрических сетей (до 1000 В). **Нач. цена**: 3500 руб. **Задаток:** 350 руб.

Лот №2. Земельный участок с кадастровым №220882719601000036, площадью 0,1489 га по адресу: Витебская обл., Браславский р-н, Друвеский с/с, д. Почта Ababье, участок №6 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (озеро Обабье), охранная зона особо охраняемых природных территорий (Национальный парк «Браславские озера»), охранная зона электрических сетей (до 1000 В). **Нач. цена**: 3500 руб. **Задаток:** 350 руб.

**Дата, время и место проведения аукциона:** 13.11.2017 в 12.00 по адресу: г. Браслав, ул. Советская, 119 в Браславском районном исполнительном комитете. **Срок внесения задатка и приема документов:** с 04.10.2017 с 8.30 по 10.11.2017 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30. **Условия аукциона:** разработать и утвердить ПСД на строительство объекта в срок, не превышающий 2 года; произвести занятие (освоение) зем. участка не позднее 1 года со дня утверждения проектной документации на строительство жилого дома; до начала строительства снять плодородный слой почвы в местах размещения строений и сооружений и использовать его в соответствии с проектной документацией. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY72AKBB36003120400080000000 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 3000594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Друвеский сельсовет). Для участия в аукционе приглашаются граждане РБ, консолидированные участники (двое и более граждан РБ)

Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка. Размер начальной цены и задатка.

Лот №1. Земельный участок с кадастровым №224650100003000608, площадью 0,1209 га, по адресу: Витебская обл., Толочинский р-н, г. Толочин, ул. Подгорная, 23 для строительства и обслуживания жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения отсутствуют. **Нач. цена**: 10 309,35 руб. **Задаток:** 1030,94 руб.

Лот №2. Земельный участок с кадастровым №224650100003000547, площадью 0,1194 га, по адресу: Витебская обл., Толочинский р-н, г. Толочин, ул. Дорожная, 23 для строительства и обслуживания жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения отсутствуют. **Нач. цена**: 10 181,44 руб. **Задаток:** 1018,14 руб.

**Дата, время и место проведения повторного аукциона:** 10.11.2017 в 15.00. по адресу: г. Толочин, ул. Ленина, 1 в Толочинском райисполкоме. Срок внесения задатков и приема документов: с 04.10.2017 с 8.30 по 09.11.2017 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» с 8.30 до 17.30 в рабочие дни. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY84AKBB36003270095710000000 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ по Витебской области (Толочинский райисполком). Для участия в аукционе приглашаются граждане, консолидированные участники (двое и более граждан) Республики Беларусь. **Условия аукциона:** получить разрешительную документацию на строительство жилых домов в Толочинском райисполкоме; до начала строительства снять плодородный слой почвы в местах размещения строений и сооружений и использовать его на улучшение приусадебного участка; в течение 6 месяцев (для юр. лиц) и 1 года (для физ. лиц) со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания зем. участка и возникновения прав на него приступить к занятию предоставленного зем.участка в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство) и закончить строительство жилого дома в течение 3 лет с даты осуществления гос. регистрации права частной собственности на зем. участок. Для участия в аукционе приглашаются граждане, негосударственные юр. лица, консолидированные участники (двое и более граждан, негосударственных юр. лиц Республики Беларусь)

Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка

Лот №1. Земельный участок с кадастровым №2246853141010002001, площадью 0,1800 га, по адресу: Витебская обл., Толочинский р-н, Толочинский с/с, аг. Райцы, ул. Молодежная, д. 10А, для строительства и обслуживания жилого дома. Ограничений в использовании нет. **Нач. цена**: 1 381,54 руб. **Размер задатка:** 138,15 руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY57AKBB36003270895590000000 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа 4901. Получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Толочинский сельисполком)

**Дата, время и место проведения повторного аукциона:** 10.11.2017 в 15.30. по адресу: г. Толочин, ул. Ленина, 1 в Толочинском райисполкоме. **Срок внесения задатков и приема документов:** с 04.10.2017 с 8.30 по 09.11.2017 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» с 8.30 до 17.30 в рабочие дни. **Условия аукциона:** получить разрешительную документацию на строительство жилого дома в Толочинском райисполкоме; в течение 1 года со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания зем. участка и возникновения права на него приступить к занятию предоставленного зем. участка в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство); до начала строительства снять плодородный слой в местах размещения строений и сооружений и использовать его на улучшение приусадебного участка. Для участия в аукционе приглашаются граждане, консолидированные участники (двое и более граждан)

Аукционы проводятся в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462. **Для участия в аукционе** граждане РБ подают заявление об участии в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт гражданина РБ, представители граждан, уполномоченные лица (представители) – документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные в установленном законодательством порядке. **Условия аукциона: победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за зем.участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и представлением участником аукциона документации, необходимой для его проведения; обратиться за гос. регистрацией права на зем. участок в двухмесячный срок со дня проведения аукциона (утверждения протокола о результатах аукциона). Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Назначение зем.участков в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: 1 09 02 – зем. участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по гос.регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем.участка. Конт. тел.: (0212) 47-20-56, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by

# ДОБРА ТАМ, ДЗЕ... МЫ ЁСЦЬ?

Фота Анатоля КІПЕЦЧУКА.

## Лепш замацоўваюцца педагогі і медыкі

«Што, на ваш погляд, можа паспрыяць замацаванню маладога спецыяліста на працоўным месцы?» — з такім пытаннем Лідскі райвыканкам звярнуўся летась да выпускнікоў, якія прыбылі ў рэгіён па размеркаванні. У анкетаванні ўдзельнічалі 164 маладыя спецыялісты. Галоўным фактарам яны назвалі высокую аплату працы: гэты пункт адзначыла 57,3 працэнта апытаных. На другім месцы аказалася перспектыва кар'ернага росту (прагаласавала 40,2 працэнта). На трэцім — наяўнасць жылля (важна для 32,3 працэнта). Неабходнасць развітой інфраструктуры адзначыў кожны сёмы малады спецыяліст.

Тое, што заробак адыгрывае вырашальную ролю, відаць і на практыцы. Калі ў сельскай гаспадарцы плацяць няшмат, дык і працэнт замацавання ў гэтай сферы самы нізкі ў раёне.

— Гэта наша балючае месца, — прызнаецца **галоўны спецыяліст аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Лідскага райвыканкама Ганна КЕНЦЬ.** — У нас шэсць сельскагаспадарчых прадпрыемстваў знаходзяцца ў стадыі банкруцтва. Натуральна, што моладзь, якая трапіла туды, будзе шукаць іншыя варыянты працаўладкавання.

> Але, адзначае спецыяліст, у цэлым працэнт замацавання ў Лідскім раёне вышэйшы за паказчык па Гродзенскай вобласці. Па статыстыцы за мінулы год, у галіне культуры засталася пасля размеркавання палова, у прамысловасці — 55 працэнтаў. Лепш за ўсё справы ў адукацыі і ахове здароўя: там замацавалася 88 і 78 працэнтаў моладзі адпаведна.

— У медыцынскіх установах іх берагуць і песцяць. Там спецыялісты адчуваюць сваю запатрабаванасць, — мяркуе Ганна Кенць.

Работа з моладдзю ў рэгіёне вядзецца па наступных кірунках: працаўладкаванне з улікам атрыманай спецыяльнасці, уцягненне ў грамадскую дзейнасць, арганізацыя стажыровак пад кіраўніцтвам вопытных кураторараў, матэрыяльнае стымуляванне. Як правіла, больш эфектыўнае замацаванне на прадпрыемствах з багатай гісторыяй і традыцыямі.

> Тое, што заробак адыгрывае вырашальную ролю, відаць і на практыцы. Калі ў сельскай гаспадарцы плацяць няшмат, дык і працэнт замацавання ў гэтай сферы самы нізкі ў раёне.

У якасці прыкладу прыводзяць Лідскую цэнтральную раённую бальніцу. Маладым спецыялістам устаноўлены надбаўкі ў памеры не менш за 10 працэнтаў ад акладу, а тым, хто скончыў вучэбныя ўстановы з адзнакай, — да 30 працэнтаў за кошт дзесяці працэнтаў планавага фонду заработнай платы. Медыкам, што працуюць на сяле, але жывуць у горадзе, кампенсуюць затраты па праездзе да месца работы і назад. У адпаведнасці з загадам галоўнага ўрача бальніцы, за маладымі спецыялістамі замацаваны кураторы з ліку дактароў, якія маюць стаж не менш за шэсць гадоў і кваліфікацыйную катэгорыю. Гэта спрыяе адаптацыі новых работнікаў на месцы і іх прафесійнаму росту.

Большасць выпускнікоў, якія размяркоўваюцца ў раён (53 працэнты) — мясцовыя і жывуць з бацькамі. Астатніх стараюцца забяспечваць пакоем у інтэрнаце ці выплачваць частковую кампенсацыю за здым кватэры.

## Сем'ям у калгасе — па катэджы

У Лагойскім раёне працэнт замацавання з года ў год застаецца высокім — 80—95.

— У нас перспектыўны рэгіён, многія просяцца сюды на размеркаванне. Па-першае, умовы працы ў арганізацыях добрыя. Па-другое, выгаднае месцазнаходжанне, побач з Мінскам. У нас ёсць галіны, дзе маладыя спецыялісты стапрацэнтна забяспечваюцца жыллём: у гэтым кірунку добра працуюць медыцына, сельская гаспадарка. На адным з комплексаў нават спецыяльна адрамантавалі дом для моладзі, забяспечылі бытавой тэхнікай, — апісвае сітуацыю **начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Лагойскага райвыканкама Яўгенія ПАЛЯШЧУК.**

> Моладзі варта было б памятаць не толькі аб тым, што павінны зрабіць для іх, але і аб тым, што першае працоўнае месца — гэта шанц праявіць сябе, заявіць аб сваіх здольнасцях.

Яна ўпэўнена: каб нядаўнія выпускнікі заставаліся ў рэгіёнах, патрэбна добрая інфраструктура. Лагойск ёй можа пахваліцца — тут ёсць і відэазала 3D, і ўстановы культуры, і школы мастацтваў, і танцавальныя і тэатральныя гурткі.

Самыя частыя пытанні, якія гучаць на сустрэчах моладзі з кіраўніцтвам раёна, — жыллёвыя. «Але, мне падаецца, яны хвалююць спецыялістаў не толькі ў нас, але і ў цэлым па краіне», — лічыць Яўгенія Паляшчук.

Як вырашаюцца жыллёвыя пытанні на канкрэтным працоўным месцы, расказалі ў сельскагаспадарчым прадпрыемстве «Наднёман» Уздзенскага раёна. Прыкладна чвэрць работнікаў гаспадаркі (гэта каля 40 чалавек) — ва ўзросце да 30 гадоў. Сямейным людзям выдзяляюць катэджы, адзінокім — пакоі ў прыватных дамах.

— Санвузлы і кухні там ужо абсталяваны. Мы самі робім ім рамонт, — дзеліцца падрабязнасцямі **намеснік кіраўніка прадпрыемства па ідэалогіі Святлана ЛАБАНАВА.** — Як толькі выпускнік па размеркаванні прыязджае, адразу засяляецца. Першыя два гады забяспечваем маладых спецыялістаў дровамі і брыкетам на ўвесь зімовы перыяд.

Цяпер у гаспадарцы выдзелена чатыры домікі для незамужніх і нежанатых маладых работнікаў і 25 — для сямейных.

## Расціць кадры з мясцовых

— Што можа ўтрымаць моладзь у раёне? — задумваецца **Юлія ЧАГАРЫНА, начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Браслаўскага райвыканкама.** — Як удала складзецца асабістае жыццё. Калі ўтвараюцца пары, маладыя людзі рэдка пераязджаюць у іншую мясцовасць. І, безумоўна, важнае значэнне маюць заробкі. Спецыялісты, якія прыходзяць у медыцыну, гэта пытанне не ўздымаюць. У банкаўскай сферы, по словах самой моладзі, таксама дастаткова зарабляюць. А вось у калгасах з нестабільным фінансавым становішчам гэта праблема стаіць востра. Але гаспадаркі стараюцца хоць неяк матэрыяльна падтрымаць маладых работнікаў. Напрыклад, праводзяць бясплатна інтэрнэт у дамы.

> Кіраўніцтва раёна сочыць за тым, каб маладыя спецыялісты былі забяспечаны ўсім неабходным. Ствараецца працоўная група, якая выязджае на месца і глядзіць, як прадпрыемства, куды размеркаваліся выпускнікі, вырашыла пытанні бытавых умоў, заробку, арганізацыі вольнага часу.

Каб зразумець, чым незадаволены юнакі і дзяўчаты, запускалася анкетаванне.

— Асноўная прэтэнзія — недахоп вольнага часу. Маладым людзям сёння хочацца мець магчымасць выязджаць некуды на адпачынак, а з-за шчыльнага працоўнага графіка гэта не атрымліваецца. Перыядычна ўзнікаюць нараканні на недастатковасць спартыўных секцый, забаўляльных устаноў... Але адна з моцных гаспадарак неяк спрабавала закупляць фітнес-абанементы для работнікаў, вазілі людзей з вёскі ў горад у трэнажорную залу. Спачатку ўсе вельмі актыўна цікавіліся, а праз два тыдні ажыятаж спаў...

На думку Юліі Чагарынай, моладзі варта было б памятаць не толькі аб тым, што павінны зрабіць для іх, але і аб тым, што першае працоўнае месца — гэта шанц праявіць сябе, заявіць аб сваіх здольнасцях. «Недахоп кваліфікаваных кадраў у арганізацыях ёсць, таму, я думаю, калі прыйдзе чалавек кваліфікаваны, актыўны, такога заўсёды падтрымаюць».

У Бярозаўскім раёне штогод каля 70 працэнтаў моладзі пасля заканчэння тэрміну размеркавання застаецца на сваіх працоўных месцах. Большасць прыходзіць у сацыяльную сферу (адукацыю і ахову здароўя). У прамысловасці добра замацоўваюцца тады, калі трапляюць на моцныя прадпрыемствы, напрыклад, на мясцовыя сыра- і мясакамбінат, камбікормавы завод.

**Загадчыца сектара па справах моладзі аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Бярозаўскага райвыканкама Вольга ЯРМАШЭВІЧ** мяркуе, што над тым, каб моладзь заставалася ў раёне, варта працаваць яшчэ са школьнай лаўкі:

— Калі прыязджаюць выпускнікі з іншых раёнаў, яны вельмі рэдка затрымліваюцца. Трэба расціць спецыялістаў са сваіх, мясцовых. Вывучаць, якія работнікі патрэбны раёну, і ўплываць на выбар навучэнцаў яшчэ ў школе, каб яны атрымлівалі адпаведную прафесію і вярталіся дадому працаваць.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

❍ У тэму

## ШТО ПАКАЗАЎ МАНІТОРЫНГ?

**Прафсаюзы Мінскай вобласці праводзілі маніторынг умоў працы і быту маладых спецыялістаў, каб высветліць, як выконваюцца гарантыі і забяспечваецца сацыяльная абароненасць работнікаў, дзе яны застаюцца, а адкуль з'язджаюць.**

Маніторынг паказаў шмат станоўчых прыкладаў замацавання ў галінах аховы здароўя, адукацыі, энергетыкі, газавай і паліўнай прамысловасці, лясной гаспадаркі.

Так, у сістэме аховы здароўя паказчык замацавання маладых спецыялістаў з вышэйшай медыцынскай адукацыяй у сярэднім па вобласці за пяць гадоў (з 2012-га па 2016-ы) склаў 66,5 працэнта. Маладыя ўрачы атрымліваюць усе гарантыі і кампенсацыі, устаноўленыя заканадаўствам. У якасці стымуляцыйных мер па кантракце прадугледжана павышэнне тарыфнай стаўкі не менш чым на 20 працэнтаў, а ў многіх арганізацыях гэта лічба павялічана да 50 працэнтаў. За мінулы год 361 малады спецыяліст палепшыў жыллёвыя ўмовы (атрымалі кватэры, арэнднае жыллё, месца ў інтэрнаце). Кампенсацыя затрат за здым кватэры выплачваецца згодна з калектыўным дагаворам у памеры ад трох да пяці базавых велічынь.

У арганізацыях адукацыі пасля двухгадовай адпрацоўкі на першым месцы застаюцца 67,7 працэнта педагогаў. Мяркуецца, што гэтаму спрыяла ў тым ліку ўключэнне ў абласное Пагадненне прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі нормы аб заключэнні кантрактаў на максімальны тэрмін са спецыялістамі трэцяга года работы, з павелічэннем акладаў на 50 працэнтаў і прадастаўленнем дадатковага водпуску ў пяць каляндарных дзён.

Адно з самых вострых пытанняў — гэта жыллё. Старшыні рэгіянальных арганізацый галіновага прафсаюзу дапамагаюць у вырашэнні згаданай праблемы. Так, у 2016—2017 навучальным годзе ў інтэрнаты Жодзіна заселены ўсе іншагароднія маладыя спецыялісты (22 чалавекі). У Мінскім раёне пасля рэканструкцыі будынка Багатыроўскай пачатковай школы пад інтэрнат у ім далі месцы 11 педагогам Азярцоўскай сярэдняй школы.

За 2015—2016 гады ў аграпрамысловы комплекс вобласці прыбылі 1280 маладых спецыялістаў. З іх 536 — тыя, хто вярнуліся на радзіму і жывуць з бацькамі, 515 атрымалі службовую кватэру (дом) ці месца ў інтэрнаце, 172 здымаюць жыллё і 57 маюць уласнае. Заробак нядаўніх выпускнікоў на сяле складае ад 200 да 800 рублёў у залежнасці ад фінансава-эканамічнага стану прадпрыемства і віду дзейнасці. Самы нізкі ўзровень заработнай платы маладых спецыялістаў — у асобных арганізацыях Любанскага, Пухавіцкага і Чэрвеньскага раёнаў.

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ

# «АДКАСІЦЬ» АД... КАЛГАСА. ЦІ ЗАСТАЦЦА?

## Карэспандэнт «МС» высвятляла, чаго не хапае маладым спецыялістам, каб застацца працаваць на сяле

Генеральны дырэктар агракамбіната «Зара» Аляксандр Корнеў ведае толк у кадрах.

**Для Алега Пятровіча ПОРТНІКА, дырэктара клічаўскага прадпрыемства «Саўгас «Дабраволец», кадравае пытанне — адно з галоўных. Сельская гаспадарка патрабуе працавітых і адказных, нават самаадданых людзей, а іх сёння, на жаль, не так шмат.**

— Сам езджу па ВНУ, падбіраю сабе спецыялістаў, — прызнаецца кіраўнік. — Дзякуй рэктару Горацкай сельгасакадэміі Паўлу Аляксандравічу Саскевічу і былому першаму прарэктару Аляксандру Уладзіміравічу Саляніку — і выслухоўвалі, і дапамагалі. Але не заўсёды атрымліваецца зацікавіць студэнтаў. Узялі аднаго, думаў, спрацуемся, а ён сышоў ад нас у міліцыю... Тут ніколі не ўгадаеш, хто застанецца, а з кім толькі дарэмна час страціш. У нас вось заатэхнік — гарадскі хлопец — працуе выдатна. Я сам мінчанін, а вось ужо з 1981 года ў сельскай гаспадарцы.

— *Але ж навучальныя ўстановы рыхтуюць маладых спецыялістаў для АПК. Ім у любым выпадку адпрацоўваць прыйдзецца. А значыць, гаспадарка без работнікаў не застанецца, — спрабую супакоіць суразмоўніка.*

— Вось гэта самае страшнае. Спецыяліст, які адпрацоўвае, — гэта міна запаволенага дзеяння. Ён не справай займаецца, а дні лічыць, каб хутчэй збегчы. Ад такіх сельскай гаспадарцы толькі шкода.

Што ж рабіць, як замацоўваць сельскагаспадарчыя кадры? Алег Портнік прапануе для пачатку хоць бы юнакоў з ліку маладых спецыялістаў не забіраць у армію. Асабліва гэта датычыцца заатэхнікаў, ветурачоў і інжынераў. Або абмяжоўвацца службай у рэзерве.

— А наогул усё пачынаецца з адпаведнага выхавання ў школе, з бацькоў. І, зразумела, гаспадарка павінна стварацьумовы — жыллём забяспечваць, плаціць годную заработную плату. У нас, напрыклад, моладзь з ліку спецыялістаў па 700—800 рублёў атрымлівае. Маладым сёння цяжка жывецца, ім трэба дапамагаць. Вось мы новы малочна-таварны комплекс адкрываем, дык аўтобус купілі і двухзменную работу збіраемся арганізаваць, каб толькі людзей набраць. Работа ў сельскай гаспадарцы цяжкая, мала ахвотных сюды ісці. Некаторыя кажуць, што лепш будуць жыць на дапамогу па беспрацоўі, але працаваць у калгас не пойдуць. Прыходзіцца збіраць ахвотнікаў з усяго раёна і вазіць.

На сайце яшчэ адной гаспадаркі Магілёўскай вобласці — агракамбіната «Зара» — каля двух дзясяткаў вакансій. І гэта пры тым, што цэнтральная сядзіба агракамбіната ўсяго за 13 кіламетраў ад Магілёва і маршрутка ходзіць туды кожную гадзіну. У аграгарадку ёсць Дом культуры, школа, дзіцячы садок, нават музычная школа. На тэрыторыі гаспадаркі больш за 10 населеных пунктаў, паміж якімі курсіруе чатыры аўтобусы. Гаспадарка шматпрофільная, мае замкнуты цыкл вытворчасці — ад вырошчвання жывёлы і птушкі і да яе рэалізацыі. Плюс раслінаводства, сёлета тут сабралі самы багаты ўраджай у вобласці (90 цэнтнераў з гектара). Ёсць свой камбікормавы завод, міні-мясакамбінат і сетка крамаў. Колькасць занятых у вытворчасці — больш за 1000 чалавек. На сёння «Зара» — адна з найлепшых гаспадарак Магілёўскай вобласці і нават краіны. Тут стабільна выплачваецца зарплата, забяспечваюцца ўсе сацыяльныя гарантыі, але... вакансіі ўсё роўна існуюць.

Сумесныя мерапрыемствы згуртоўваюць. Калектыў агракамбіната «Зара».

— Перыядычна ўзнікаюць праблемы з кадрамі, — уздыхае **начальнік аддзела па кадрах агракамбіната Святлана СКРАБУНОВА.** — Бывае дэфіцыт ветурачоў, — дзяўчаты прыязджаюць, а потым у дэкрэт ідуць. Хоць часцей за ўсё не хапае рабочых рук. Што датычыцца спецыялістаў, то за апошнія пяць гадоў з 22 спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, якія прыйшлі сюды працаваць, засталіся 16, з сярэднеспецыяльнай — 13 з 16. Але частка звольнілася ў сувязі з прызывам у армію. Цяпер на стацыянары ў Віцебску два чалавекі вучыцца — заатэхнік і ветурач, а таксама адзін на аграномка ў Горацкай сельгасакадэміі. Яшчэ 32 чалавекі завочна атрымліваюць дыплом. З іх 16 — у сельскагаспадарчых ВНУ. Сёння амаль няма цякучасці кадраў. У калектыве шмат надзейных людзей, якія самаддана працуюць.

Святлана Маркіянаўна сама прыйшла ў гаспадарку як малады спецыяліст болей чым 30 гадоў таму. Муж вучыўся па накіраванні ад гаспадаркі, потым прыехаў адпрацоўваць. Яго маладую жонку спачатку размеркавалі ў Магілёў, але яна праз некалькі гадоў пераехала ў вёску.

— Нам хутка далі трохпакаёўку, потым дапамагалі будаваць свой дом, — успамінае яна. — Ніколі не сумавала, шчыравала на сваім участку, вырошчвала гародніну і кветкі.

**Намеснік генеральнага дырэктара гаспадаркі па ветэрынарыі Таццяна БАДЗЕЯВА** прыехала сюды па размеркаванні сем гадоў таму, пасля Віцебскага ветэрынарнага інстытута. Сама родам з Брэсцкай вобласці.

— Вельмі спадабаўся кіраўнік, якім на той час быў Леанід Маісееў, — усміхаецца яна. — Мне, як маладому спецыялісту, адразу ж далі жыллё. А каб не было калі сумаваць, паступіла ў Магілёўскі ўніверсітэт харчавання на інжынера-тэхнолага па мясаперапрацоўцы. У нас жа шматпрофільнае прадпрыемства, ёсць дзе веды прыкласці.

Таццяна ацаніла і тое, што кіраўніцтва не стрымлівае маладыя кадры ў дзейнасці, дае магчымасць паспрабаваць нешта новае.

**Яўгенія СУБОЦІНА, інспектар па кадрах,** спачатку не думала заставацца, але вось ужо пяць гадоў працуе. У вольны час удзельнічае ў самадзейнасці. У мясцовым Доме культуры ёсць усё для развіцця сваіх творчых схільнасцяў. На раённым конкурсе «Маладая гаспадыня» дзяўчына заваявала прыз сімпатый гледачоў. За час працы ў гаспадарцы атрымала завочна вышэйшую адукацыю, стала дыпламаваным юрыстам.

— У нас добрая магчымасць кар'ернага росту, — удакладняе Святлана Скрабунова. — Шэраг намеснікаў генеральнага дырэктара менавіта маладыя спецыялісты: Яўген Сялюгін — намеснік па раслінаводстве, Раман Чумакоў — па механізацыі, Ірына Ігнаценка — па свінаводстве... А яшчэ жыллё, заробак. Калі нехта хоча здымаць жыллё, выплачваем дзве базавыя. Што важна, за кожным маладым спецыялістам замацоўваецца настаўнік.

**Раману ЧУМАКОВУ, намесніку генеральнага дырэктара,** 28 гадоў.

— Скончыў Горацкую акадэмію, — расказвае ён пра свой шлях у сельскую гаспадарку. — Пяць гадоў таму на аб'яве ў газеце прыйшоў працаваць у «Зару». Чаму моладзь не вельмі ахвотна ідзе ў сельскую гаспадарку? Таму што тут работа ад цямна да цямна, часта без выхадных. Нагрузкі ўсё больш і больш, а матэрыяльнае становішча застаецца ранейшым. І гэта пры тым, што зарплата своечасова выплачваецца, высокія паказчыкі стымулююцца. Трэба працаваць, не звяртаючы ўвагі на час, графік і нават стан здароўя... Я сам з вёскі. Калі ў «Зару» прыйшоў, мне 22 гады споўнілася. Спачатку было складана, але дапамагала кіраўніцтва. Гэта вельмі важна. Ад году ў год мне ўсё лягчэй працаваць, таму што я ведаю падводныя камяні, як іх абысці. Зараз пад маім кіраўніцтвам каля 100 механізатараў, а яшчэ работнікі рамонтнай майстэрні і іншых аб'ектаў.

Моладзь на агракамбінаце сапраўды сур'ёзная, адчуваецца стрыжань, характар, зацікаўленасць.

— І дзе вы толькі такіх знаходзіце? — пытаюся я ў **генеральнага дырэктара агракамбіната «Зара» Аляксандра КОРНЕВА.**

— А нам абы хто не патрэбны, — адказвае ён. — Гэта павінны быць прафесіяналы сваёй справы. Даём выпрабавальны тэрмін, назіраем, выбіраем, конкурс праводзім. Разглядаем іх справы, пасылаем запыты, вывучаем характарыстыкі і толькі потым запрашаем на работу. Асабліва цесна працуем з Віцебскай акадэміяй ветэрынарнай медыцыны і БДСГА ў Горках.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
*zigulya@zviazda.by*

**Фота аўтара і з архіва агракамбіната «Зара».**

**Леанід МАІСЕЕЎ, старшыня назіральнага савета ЗАТ «Агракамбінат «Зара», поўны кавалер Ордэна Айчыны:**

— Сёння, на жаль, не тая моладзь, што была раней, у маладых няма цікавасці. Нашы ВНУ набіраюць усіх агулам. Калі я паступаў у Віцебскі ветэрынарны інстытут, быў конкурс пяць чалавек на месца. А зараз на адно месца адзін чалавек. А калі так, то якія могуць быць спецыялісты?

Што датычыцца ўмоў, то лепшых, чым у нас, няма. Калі да нас спецыяліст з вышэйшай адукацыяй прыходзіць, мы яму — і зарплату, і пасаду, і дом, калі сям'я ёсць. Як замацаваць маладых людзей у іншых гаспадарках, пытанне складанае. Сёння нават вопытны кіраўнік не можа справіцца з гаспадаркай. Колькі ў нас такіх вызвалілі ад работы. А ўсе яны да прызначэння былі добрыя спецыялісты. Калі я ўзначаліў гаспадарку, мне было 29 гадоў. Першы час кіраўніцтва райвыканкама кожны месяц наведвалася ў гаспадарку, дапамагалі, падказвалі. Цяпер такое ёсць? Няма. А што можна ўзяць ад маладога чалавека, які толькі закончыў акадэмію? Што ён там бачыў? Ну яшчэ тры—чатыры гады папрацаваў у гаспадарцы. Дык гэта зусім яшчэ зялёны спецыяліст.

**Галіна ПРОХАРАВА, начальнік аддзела кадраў і аграрнай адукацыі камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванню Магілёўскага аблвыканкама:**

— Сістэмна працуем з кадрамі, каб маладыя спецыялісты разумелі, што ў сельскай гаспадарцы не ўсё так дрэнна. Штогод на 1% забяспечанасць кадрамі павялічваецца.

Найбольш запатрабаваныя заатэхнічныя кадры і ветэрынары. Хапае і эканамістаў. А вось, напрыклад, будаўнікоў сёлета праблематычна было працаўладкаваць. Цяжкасці ёсць, бо на сяле і ў горадзе не роўныя ўмовы існавання. Але, калі чалавек свядома выбраў прафесію, ён не думае пра тое, каб збегчы. У кожнай гаспадарцы свае падыходы да прыцягнення кадраў. Зараз робім акцэнт на мэтавых дагаворах. Кіраўнік павінен сам адсочваць працэс абнаўлення кадраў, калі бачыць, што яны старэюць. Пакуль спецыяліст пяць гадоў адпрацуе ў гаспадарцы, ён і сям'ёй абзавядзецца, і прафесію палюбіць.

Забяспечанасць кадрамі на сённяшні дзень у раёнах Магілёўскай вобласці розная. Напрыклад, Хоцімскі раён на 80% забяспечаны заатэхнікамі і на 89% ветурачамі. Крычаўскі — на 75% і 80% адпаведна, Быхаўскі — на 75% і 75%.

МЕРКАВАННІ

## Што трэба зрабіць, каб маладыя спецыялісты не з'язджалі пасля заканчэння тэрміну адпрацоўкі?

**Не сакрэт, што далёка не многія выпускнікі навучальных устаноў гараць жаданнем працаваць у глыбінцы і аддаленых раёнах, а калі іх туды накіроўваюць, то з нецярпеннем чакаюць апошняга дня адпрацоўкі. Як змяніць гэтую сітуацыю? Сваімі меркаваннямі падзяліліся супрацоўнікі ведамстваў і арганізацый, зацікаўленых у новых прафесійных кадрах.**

**Старшыня Людзяневіцкага сельскага выканаўчага камітэта Жыткавіцкага раёна Юрый ВОЛЧЫК:**

— Як утрымаць маладога спецыяліста? Зарплата, жыллё, а таксама ўмовы, нейкі сацыяльны пакет. Мне здаецца, у яго павінны ўваходзіць не толькі медыцынскае абслугоўванне, але і культурны складнік, нейкія забавы. Чамусьці апошнім часам у вёсках усё гэта згортваецца. Напрыклад, няма сувязі: паштовыя аддзяленні закрываюцца, паштальёны вешаюць адну скрынку на некалькі дамоў. Чаму? Яны мне кажуць, што гэта эканамічна нявыгадна. І як тады чалавек будзе газету выпісваць, калі мы сёння пасылаем чалавеку ліст — а яго нават няма каму данесці? І гэта толькі адзін прыклад. Бытавое абслугоўванне таксама вымушае жадаць лепшага, і гэта адыгрывае ролю. Хацелася б, каб моладзь заставалася, але рэаліі такія, што зрабіць гэта складана. Што ад нас залежыць, мы робім: жыллём забяспечваем, напрыклад.

**Начальнік упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мсціслаўскага раённага выканаўчага камітэта Ларыса ФІЛІПЕНКА:**

— Перш за ўсё патрэбны сацыяльны пакет, каб зацікавіць маладога спецыяліста. Што яшчэ? Вядома, неабходна прадастаўленне жылля, каб у выпускніка не было патрэбы клапаціцца аб здыманні кватэры ці дома, плаціць вялікія грошы. Акрамя таго, я лічу, што пакуль малады спецыяліст не набраўся вопыту, павінна быць грашовая надбаўка да зарплаты. Так, ёсць даплата, але яна разавая, а таксама выплачваецца не зусім у тым абʼёме, што патрэбны, як мне здаецца. Таму я прапаную выплачваць штомесячную надбаўку да зарплаты. Яшчэ адзін момант: вельмі важна, як чалавека прымаюць у калектыве, таму я настойваю, што павінна быць нейкае настаўніцтва. Яно ёсць і цяпер, але калі гэта чыстая фармальнасць, то ў ім няма сэнсу. Павінен быць дасведчаны чалавек, які можа чамусьці навучыць, увесці ў прафесію. Па сутнасці, працаваць прыязджае ўчарашні студэнт. Як тут без падтрымкі?

**Намеснік галоўнага ўрача па медыцынскай частцы Карэліцкай цэнтральнай раённай бальніцы Аляксей КАЎЦЭВІЧ:**

— Тут трэба працаваць у двух кірунках. Першае — забяспечыць дастойную заработную плату маладым спецыялістам, а другое — годнае жыллё. Калі прапрацоўваць гэтыя два моманты, то людзі будуць зацікаўлены, каб застацца на першым працоўным месцы. У асноўным, моладзь жыве ў інтэрнатах, але калі доктар атрымлівае толькі пакой, то сям'я — як мінімум блок, а гэта ўжо камфортныя ўмовы для старту. Што датычыцца зарплаты, у цэлым сёння ні адна дзяржаўная сфера не можа пахваліцца высокай зарплатай. У той жа час заробкі ў медыцынскай сферы, педагагічнай маглі б быць і крыху вышэйшыя.

**Галоўны інжынер сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва «Свіслач» Гродзенскага раёна Васіль ШЭЛЯГ:**

— Калі ў чалавека няма жадання, дык як ты яго ўтрымаеш, а галоўнае — навошта? У той жа сельскай гаспадарцы, калі чалавек убачыць гэтую няпростую працу, яго цяжка будзе прымусіць застацца. Палепшыць умовы? У нас так проста не бывае: калі ў гарадах субота і нядзеля выхадныя, то ў сельскагаспадарчых прадпрыемствах бывае, што ты працуеш з раніцы да вечара як па буднях, так і ў суботу і нядзелю... І вось ёсць два варыянты: першы — спакойна працаваць у горадзе з дзевяці гадзін раніцы да шасці вечара, нічога не рабіць на выхадных. Другі — працаваць у любы час, заўсёды і ўсюды, пры гэтым заробак ці той жа, ці нават ніжэйшы. Вось такая сітуацыя атрымліваецца.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**
*lukashevich@zviazda.by*

ПАЕХАЛІ!

# НА ПРАЦУ Ў ГЛЫБ ПАЛЕССЯ

## Больш за палову маладых спецыялістаў з'язджае пасля адпрацоўкі з Ганцавіцкага раёна. Сорак працэнтаў застаецца

**Гадоў дзесяць таму выпускніца ганцавіцкай школы №2, на той час навучэнка каледжа мастацтваў, Алена Сталярэнка заявіла падчас сустрэчы выпускнікоў: «Я прыеду сюды і зраблю так, што праз тры гады Ганцавічы затанцуюць».**
**Некаторыя тады палічылі заяву амбіцыйнай.**
**А яна сказала — зрабіла.**
**Раней з харэаграфіяй тут было сапраўды не вельмі. Цяпер танцамі ў палескім райцэнтры займаецца больш за сотню дзяцей. І ўжо вучні Алены Аляксандраўны (цяпер яе прозвішча Варэйка) прыязджаюць у дзіцячую школу мастацтваў у якасці педагогаў.**

### Вучаніца — настаўніца

Пра гэты цікавы факт з жыцця раённай школы мастацтваў расказаў намеснік старшыні Ганцавіцкага райвыканкама Сяргей САРОКАЎ. Сяргей Вітальевіч падкрэсліў, што Алена Варэйка знайшла калег-аднадумцаў і яны захвоцілі да заняткаў танцамі столькі школьнікаў, што на справаздачных канцэртах зала літаральна не можа ўмясціць гледачоў — родных, блізкіх, сяброў юных танцораў.

У ліку многіх выхаванцаў школы была і Аліна Сапун. Сёлета пасля заканчэння Пінскага каледжа мастацтваў Аліна прыйшла ў родную школу настаўніцай харэаграфіі. Работа ёй падабаецца. З жыллём праблем няма — жыве дома, у бацькоў. Пакуль яна не можа сказаць, што адназначна застанецца ў родным горадзе. Толькі адно ведае Аліна Сапун дакладна, што харэаграфія назаўсёды стане яе прафесіяй, якую яна выбрала пад уплывам Алены Аляксандраўны Варэйкі.

Дзяніс САЛАДУХА.

### Унікальная практыка для ўрача

Варта адзначыць, што ва ўстановах адукацыі і культуры пасля абавязковай адпрацоўкі ў раёне застаецца больш за палову маладых спецыялістаў. Як, дарэчы, і ў медыцынскіх установах. Пагутарыла з двума маладымі ўрачамі, якія прыехалі на размеркаванні ў Ганцавічы ў 2011 годзе і засталіся тут. Уладзімір Цанда — урач лабараторнай дыягностыкі, з 2012 года працуе загадчыкам лабараторыі. Уладзімір Мікалаевіч падкрэсліў, што ў іх раённай бальніцы ўстаноўлена новае сучаснае дыягнастычнае абсталяванне, якое не саступае лабараторыям у Баранавічах або ў Брэсце. А наконт скарыстання вольнага часу доктар указаў на магчымасць у выхадныя паехаць у Баранавічы, Брэст, сталіцу. Чыгуначныя зносіны добрыя, ёсць і свой транспарт. Уладзімір Цанда разам з жонкай, урачом-педыятрам, гадуюць дваіх дзяцей, жывуць у службовай кватэры, якую атрымалі адразу пасля прыезду на працу. Потым сям'я ўзяла ўчастак і цяпер будуе свой дом.

Аналагічныя жыллёвыя ўмовы і ў калегі — доктара Дзяніса Саладухі. Яны з жонкай, урачом функцыянальнай дыягностыкі, таксама ўзводзяць уласнае жыллё. Дзяніс Віктаравіч — урач анестэзіёлаг-рэаніматолаг, цяпер выконвае абавязкі загадчыка аддзялення. Кажа, што ў раённай бальніцы ў доктара ёсць магчымасці для практыкі, якую не атрымаеш у клініцы вялікага горада, дзе вузкая спецыялізацыя. Тут жа маеш справу з пацыентамі ва ўзросце ад нованароджанага да пажылога чалавека з узроставымі паталогіямі: «Скажам, у першы год работы я сутыкнуўся з такімі выпадкамі, як аказанне дапамогі пры ўкусе гадзюкі ў язык ды складанымі аперацыямі накшталт кесарава сячэння. Працаваць цікава. Вядома, ёсць свая спецыфіка. У вялікім горадзе ты адпрацаваў змену — і свабодны. Тут ты заўсёды на сувязі. І калі спатрэбіцца, цябе выклічуць ноччу, у выхадны ці святочны дзень».

Аліна САПУН.

Яшчэ Дзяніс адзначыў, што яму пашанцавала прыехаць сюды менавіта ў 2011 годзе, калі ў Ганцавічах памянялася кіраўніцтва раённай медыцынай. Новы кіраўнік, давялося пачуць ад многіх маладых урачоў, вельмі ўважліва ставіцца да маладога папаўнення і робіць усё магчымае, каб спецыялісты заставаліся.

Андрэй Халецкі пасля заканчэння Віцебскага медыцынскага ўніверсітэта прыехаў на работу сёлета і адразу стаў галоўным урачом Малькавіцкай сельскай участковай бальніцы. Прыём у паліклініцы, абслугоўванне выклікаў, выезд на два ФАПы, якія ў зоне абслугоўвання ўчастка, стацыянар на 25 ложкаў, — адным словам, работы маладому доктару хапае. Пакуль Андрэй Аляксандравіч не будуе далёкіх планаў, але ўжо зразумеў, што тут ён атрымае ўнікальны вопыт.

### Час пакажа

Лясная гаспадарка мае нядрэнныя паказчыкі замацавання моладзі. З усіх прыбылых на работу застаецца прыкладна палова. Прыкладам у гэтым сэнсе можа паслужыць, пэўна, Аляксей Дзічка, ляснічы Хатыніцкага лясніцтва. Аляксей прыехаў па размеркаванні ў лясгас у 2014 годзе, і вось ён ужо ляснічы, кіруе калектывам з 16 чалавек, адказвае за 12,7 тысячы гектараў лясных угоддзяў. Аляксей мясцовы, жыве з бацькамі, ездзіць на работу з Ганцавіч. Ён з дынастыі леснікоў, у лесе працавалі дзядзькі, дзяды і па бацькавай, і па матчынай лініі. Таму хлопец з маленства не бачыў сябе ў іншай прафесіі, адказна рыхтаваўся да паступлення, паспяхова скончыў ВНУ. «Менавіта на сваіх, мясцовых выпускнікоў школ трэба рабіць стаўку,» — лічыць намеснік старшыні райвыканкама Сяргей Сарокаў.

> А вось у сельскай гаспадарцы за апошнія пяць гадоў засталося толькі 30 працэнтаў маладых спецыялістаў, якія прыязджалі па накіраванні. Напрыклад, у 2011 годзе на работу прыехаў 21 малады спецыяліст, а пасля адпрацоўкі застаўся толькі адзін. З выпускнікоў 2014 года замацавалася больш за 60 працэнтаў.

Землі на Ганцаўшчыне не надта ўрадлівыя, гаспадаркі не вельмі паспяховыя. Адсюль зарплаты, сацыяльныя даброты і іншае. Але ж на выбар спецыялістаў уплывае шмат абставін. Скажам, бухгалтар ААТ «Люсіна Агра» Надзея Храпіцкая пакуль не збіраецца шукаць новае месца працы. Дзяўчыне далі дом — службовае жыллё з так званых прэзідэнцкіх домікаў. Ёй падабаецца вёска, якую цяпер называюць аграгарадком. А вось яе калега па працы Дзмітрый Шаламіцкі, які займаецца электразабеспячэннем гаспадаркі пасля заканчэння Пружанскага аграрнага каледжа, любіць гарадскія выгоды, дзе больш магчымасцяў для актыўнага адпачынку. І хлопец, і дзяўчына працягваюць вучобу завочна, атрымліваюць вышэйшую адукацыю. Дзмітрыю таксама далі тут службовае жыллё. Маладыя людзі атрымліваюць даплаты з бюджэту, вызначаныя для маладых спецыялістаў. Пакуль што ўпэўнена адказаць на пытанне, ці з'едуць адсюль, яны не могуць — час пакажа.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*

Надзея ХРАПІЦКАЯ і Дзмітрый ШАЛАМІЦКІ.

**Сяргей САРОКАЎ, намеснік старшыні Ганцавіцкага райвыканкама:**

— Пытанні работы з маладымі спецыялістамі разглядаліся на пасяджэнні райвыканкама ў 2015 годзе, іх абмяркоўвалі на сесіі раённага Савета летась. Сёлета адбыўся каардынацыйны савет па гэтай тэме. У нас сталі традыцыяй сустрэчы старшынь райвыканкама і райсавета з маладымі спецыялістамі. Перад гэтым супрацоўнікі райвыканкама выязджаюць на месцы, каб азнаёміцца з умовамі пражывання выпускнікоў навучальных устаноў. Звычайна гэтыя абследаванні ладзяцца ў кастрычніку. Сёлета ўсіх маладых спецыялістаў аб'ехалі за верасень. На месцы ўдалося ліквідаваць агрэхі па добраўпарадкаванні жылля, на якія ўказала моладзь.

Хачу адзначыць, што вельмі нядрэнна замацоўваюцца маладыя спецыялісты ў галінах адукацыі, аховы здароўя, лясной гаспадарцы. Крыху горшая сітуацыя ў сельскай гаспадарцы, дзе застаецца адзін з трох размеркаваных. А вось у галіне гандлю і грамадскага харчавання, у прамысловай вытворчасці ўвогуле застаецца толькі адзін з пяці маладых спецыялістаў. Арганізацыям, установам названых галін трэба перастройваць работу ў адпаведнасці з часам, каб у маладых спецыялістаў была магчымасць развівацца, прыстойна зарабляць, будаваць жыллё. Многім кіраўнікам трэба больш уважліва ставіцца да патрэб маладых спецыялістаў.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

| Извещение о проведении аукциона | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Оршаагропромснаб», Витебская обл., г. Орша, ул. Ленина, 215 |

**Предмет аукциона**

**Месторасположение: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Кирова, д. 79, площадки на заводской территории**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|---|
| **Площадки на заводской территории** | Сооружение неустановленного назначения | 3406 кв. м | 110/С-112474 |

***Сведения о земельном участке***: пл. **1,1024** га предоставлен продавцу для обслуживания площадок на заводской территории и проезда на праве постоянного пользования. Описание права, ограничения (обременения) прав: охранные зоны электрических сетей напряжением до 1000 вольт, пл. 0,0858 га

**Начальная цена с НДС 20% – 83 949,83 бел. руб.**

**Задаток 1% от начальной цены лота** в белорусских рублях перечисляется на р/с №BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Аукцион состоится 09.11.2017 в 11.00** по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 08.11.2017 до 17.00 по** указанному адресу. **Тел.: +375 17 280-36-37; 8 029 317-95-42. www.cpo.by. Email: auction@cpo.by**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблреклама» (продавец) извещает о проведении 6 ноября 2017 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества одним лотом, с учетом НДС (20%), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20%), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| | **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340100000006004802 площадью 0,1849 га** – для эксплуатации и обслуживания административного здания. **Местонахождение:** Гомельская область, г. Гомель, ул. Борисенко, д. 7 | | |
| 1 | **Капитальное строение с инв. №350/С-42584, общей площадью 1 616,7 кв. м,** назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **административный корпус.** Составные части и принадлежности: галерея. Забор железобетонный **36,0 п. м** (инв. №114), озеленение (7 деревьев) (инв. №13), вертикальные планировки и благоустройство (инв. №12), в т.ч.: проезжая часть **632,0 кв. м**, борты **42,0 кв. м**; распределительные пункты ПР – 3 шт. (инв. №37); распредустройство – 3 шт. (инв. №32) | **333 140,00** | **16 657,00** |

**Продавец:** ОАО «Гомельоблреклама», г. Гомель, ул. Гагарина, 20. Конт. тел.: 8 (029) 694-43-89, 8 (0232) 23-23-53 – Грачева Полина Станиславовна. **Шаг аукционных торгов – 5%.**

**Для участия в аукционе необходимо:** 1) Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца имущества (ОАО «Гомельоблреклама»):** р/с BY34BAPB30122093700130000000, БИК BAPBBY23912, Филиал ОАО «Белагропромбанк» ГОУ, УНП 400071204,ОКПО 285728963000, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

2) Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 4 октября 2017 г**. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00, **прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 3 ноября 2017 г. в 16.00. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Для участия в аукционе представляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до его проведения.** В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом имущества** в течение **5 (пяти)** рабочих дней со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **20 (двадцати) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. **В соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь может быть предоставлена рассрочка оплаты имущества**. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62. Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы»**

Утерянную печать ООО «ВЛАТА-ИНТЕР», УНП 600277724, считать недействительной

Печати, штампы ЧТУП «СаниТекст» (УНП 191245916) считать недействительными в связи с утерей. УНП191720323

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

| Извещение о проведении третьего аукциона | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «БПС-Сбербанк»; г. Минск, бульвар им. Мулявина, 6 |

**Предмет аукциона**

| № лота | Наименование | Начальные цены с учетом НДС 20%, бел. руб. (снижены на 20%) |
|---|---|---|
| 1 | **Здание гаража,** общ. пл. 120 кв. м, инв. номер 612/С-3842, адрес: Минская обл., Жодино, ул. 40 лет Октября, 15, А | 47 174,40 |
| 2 | **Встроенное помещение,** общ. пл. 326 кв. м, инв. номер 200/D-87601, адрес: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81 | 88 368,00 |
| 3 | **Здание гаражей,** общ. пл. 85,5 кв. м, инв. номер 420/D-1335, адрес: г. Лида, ул. Красноармейская. **Обременения:** частичная аренда 20,5 кв. м | 9 776,64 |
| 4 | **Одноэтажное, кирпичное здание гаража,** общ. пл. 18,7 кв. м, инв. №332/С-49327, адрес: Гомельская обл., Житковичский р-н, г. Житковичи, ул. Фридрихa Энгельса, 32А/3. **Земельный участок** общ. пл. 0,0021 га предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания гаража | 3 196,27 |
| 5 | **Здание закрытой автостоянки,** общ. пл. 313 кв. м, инв. №330/С-11219, адрес: Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Ленинская, 2. **Земельный участок** общ. пл. 0,2582 га предоставлен на праве постоянного пользования для строительства и обслуживания здания отделения ОАО «Белпромстройбанк» | 46 440,00 |
| 6 | **Здание банка,** общ. пл. 3062,3 кв. м, инв. №350/С-77314, адрес: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Фрунзе, д. 6. **Земельный участок** общ. пл. 0,2037 га предоставлен на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания административного здания. **Обременения:** частичная аренда 775,03 кв. м | 3 139 867,20 |
| 7 | **Торговое помещение,** общ. пл. 197,8 кв. м, инв. №500/D-7102445, адрес: г. Минск, ул. Уманская, 54-49. **Обременения:** аренда | 409 874,88 |
| 8 | **Магазин,** общ. пл. 1176,8 кв. м, инв. №500/С-22967, адрес: г. Минск, ул. Уручская, д. 19Б, корп. 5. **Земельный участок** общ. пл. 7,7627 га предоставлен на праве долевого постоянного пользования (доля в праве 131/625) для реконструкции существующих зданий и сооружений под торговые павильоны и строительство новых зданий, сооружений и торговых павильонов рынка по продаже строительных, электротехнических, сантехнических материалов и оборудования с установленными ограничениями. **Обременения:** частичная аренда 300 кв. м | 2 218 588,80 |
| 9 | **Помещение №10 в подвале административно-торгово-бытового корпуса,** общ. пл. 142,0 кв. м, инв. №500/D-672081, адрес: г. Минск, ул. Мележа, 5/1-10 | 188 501,30 |
| 10 | **Помещение неустановленного назначения,** общ. пл. 171,8 кв. м, инв. №500/D-671247, адрес: г. Минск, ул. Мележа, 5/1-108 | 227 501,57 |
| 11 | **Гараж,** общ. пл. 94,7 кв. м, инв. №100/С-68949, адрес: Брестская обл., г. Брест, ул. Советской Конституции, 4. **Земельный участок** общ. пл. 0,3441га предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания банка и здания гаража | 27 198,72 |
| 12 | **Гаражное и складское хозяйство инкассаторской службы,** общ. пл. 396,0 кв. м, инв. №100/С-2860, адрес: Брестская обл., г. Брест, ул. Советской Конституции, д. 4. **Земельный участок** общ. пл. 0,4581 га предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания гаражного и складского хозяйства инкассаторской службы | 83 064,96 |
| 13 | **Административное помещение,** общ. пл. 405,1 кв. м, инв. №333/D-26401, адрес: Гомельская обл., Калинковичский р-н, г. Калинковичи, ул. Советская, 96А-2 | 305 063,04 |
| 14 | **Здание банка,** общ. пл. 1 312,8 кв. м, инв. №612/С-3827, адрес: Минская обл., г. Жодино, ул. Деревянко, д. 3а. **Земельный участок** общ. пл. 0,3208 га предоставлен на праве постоянного пользования для размещения административного здания банка | 792 060,48 |
| 15 | **Приемный пункт №13,** общ. пл. 256,7 кв. м, инв. №100/С-1753, адрес: Брестская обл., г. Брест, ул. Красногвардейская, д. 88/2. **Земельный участок** общ. пл. 0,1678 га предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания приемного пункта №13. **Обременения:** аренда | 213 176,64 |
| 16 | **Здание столовой,** общ. пл. 3403,7 кв. м, инв. №350/С-70220, адрес: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Интернациональная, 10. **Земельный участок** общ. пл. 0,1587 га предоставлен на праве постоянного пользования для эксплуатации и обслуживания здания столовой | 2 082 145,92 |
| 17 | **Входная группа «Марокко»,** общ. пл. 2238,8 кв. м, инв. №500/С-55701, адрес: г. Минск, ул. Орловская, д. 80. **Земельный участок** общ. пл. 12,8699 га предоставлен на праве постоянного долевого пользования (доля в праве 27/2000) для строительства и обслуживания. **Обременения: частичная аренда 55,0 кв. м** | 2 218 588,80 |
| 18 | Административно-торговое помещение, общ.пл. 61,0 кв.м., инв. №500/D-708155172, адрес: г. Минск, ул. Кальварийская 16-213. Обременения: аренда. | 139 837,44 |
| 19 | **Административно-торговое помещение,** общ. пл. 223,0 кв. м, инв. №500/D-708155175, адрес: г. Минск, ул. Кальварийская, 16-222. **Обременения:** аренда | 497 213,76 |
| 20 | **Административное помещение,** общ. пл. 222,7 кв. м, инв. №500/D-708155179, адрес: г. Минск, ул. Кальварийская, 16-242. **Обременения: аренда** | 496 544,64 |
| 21 | **Административно-торговое помещение,** общ. пл. 226,2 кв. м, инв. №500/D-708155183, адрес: г. Минск, ул. Кальварийская, 16-262 | 519 312,96 |
| 22 | **Административно-торговое помещение,** общ. пл. 286,8 кв. м, инв. №500/D-708155186, адрес: г. Минск, ул. Кальварийская, 16-280 | 546 301,44 |
| 23 | **Административно-торговое помещение,** общ. пл. 269,0 кв. м, инв. №500/D-708155174, адрес: г. Минск, ул. Кальварийская, 16-221 | 607 444,80 |
| 24 | **Административно-торговое помещение,** общ. пл. 280,6 кв. м, инв. №500/D-708155178, адрес: г. Минск, ул. Кальварийская, 16-241 | 632 267,52 |
| 25-59 | **Машино-место №№228, 231, 232, 234, 247, 241, 242, 244, 245, 246, 249, 254, 255, 257, 261, 262, 263, 265, 266, 269, 271, 272, 277, 278, 279, 229, 233, 235, 236, 240, 248, 253, 256, 260, 264** по адресу: г. Минск, ул. Гамарника, 16а. Площадь от 12,1 кв. м до 12,2 кв. м **Обременения** по машино-местам №№228, 231, 232, 234, 242, 244, 245, 246, 249, 254, 263, 265, 271, 272, 277, 278, 279, 248: аренда | 8 620,80 |
| 60-63 | **Машино-место №227,239,250,276** по адресу: г. Минск, ул. Гамарника, 16а. Площадь от 11,3 кв. м до 13,8 кв. м | 7 098,28 |
| 64-65 | **Машино-место №267,268** по адресу: г. Минск, ул. Гамарника, 16а. Площадь 14,2 кв. м | 8 219,06 |
| 66 | **Машино-место №163,** общ. пл. 12,8 кв. м, инв. №500/D-708039745, по адресу: г. Минск, ул. Гамарника, 16а-163 | 7 471,87 |
| 67 | **Машино-место №226,** общ. пл. 11,8 кв. м, инв. №500/D-708039756, по адресу: г. Минск, ул. Гамарника, 16а-226 | 6 911,48 |
| 68 | **Машино-место №252,** общ. пл. 10,0 кв. м, инв. №500/D-708039781, по адресу: г. Минск, ул. Гамарника, 16а-252 | 6 351,09 |
| 69 | **Машино-место №273,** общ. пл. 10,3 кв. м, инв. №500/D-708039801, по адресу: г. Минск, ул. Гамарника, 16а-273 | 6 537,89 |
| 70-147 | **Машино-место №826-845, 848, 849, 852-865, 867-869, 871, 909, 572, 573, 625, 628, 634, 669-676, 678 ,680, 683, 691, 692, 694, 695, 697, 698, 700, 706, 707, 708, 710, 714-718, 720, 724, 725, 727,728** по адресу: г. Минск, ул. Леонида Беды, 45. Площадь от 10,3 кв. м до 14,5 кв. м | 12 566,75 |
| 148-150 | **Машино-место №846, 847, 866,** по адресу: г. Минск, ул. Леонида Беды, 45. Площадь от 16,1 кв. м до 18,7 кв. м | 13 758,43 |
| 151-155 | **Машино-место №638, 721, 726, 732, 733** по адресу: г. Минск, ул. Леонида Беды, 45. Площадь от 8,2 кв. м до 10,0 кв. м | 11 158,41 |
| **№ лота** | **Наименование** | **Начальные цены без учета НДС бел. руб. (снижены на 20%)** |
| 156 | **Квартира,** общ. пл. 46,2 кв. м, инв. №500/D-708141564, число комнат – 1, адрес: г. Минск, ул. Алибегова, 26-17 | 81 944,00 |
| 157 | **Квартира №34,** общ. пл. 137,2 кв. м, инв. №420/D-59519, число комнат – 4, адрес: Гродненская обл., г. Лида, б-р князя Гедимина, 10-34 | 111 556,00 |
| | **Квартиры, расположенные по адресу: г. Минск, ул. Кальварийская, 16** | |
| 158 | **Квартира №10,** общ. пл. 82,9 кв. м, инв. №500/D-708121002, число комнат – 3 | 173 784,00 |
| 159 | **Квартира №11,** общ. пл. 95,8 кв. м, инв. №500/D-708121003, число комнат – 3 | 188 688,00 |
| 160 | **Квартира №12,** общ. пл. 135,0 кв. м, инв. №500/D-708121004, число комнат – 3 | 245 464,00 |
| 161 | **Квартира №16,** общ. пл. 135,8 кв. м, инв. №500/D-708121008, число комнат – 3 | 246 568,00 |
| 162 | **Квартира №19,** общ. пл. 95,7 кв. м, инв. №500/D-708121011, число комнат – 3 | 196 904,00 |
| 163 | **Квартира №20,** общ. пл. 135,2 кв. м, инв. №500/D-708121012, число комнат – 3 | 256 856,00 |
| 164 | **Квартира №23,** общ. пл. 95,6 кв. м, инв. №500/D-708121015, число комнат – 3 | 196 736,00 |
| 165 | **Квартира №24,** общ. пл. 135,1 кв. м, инв. №500/D-708121016, число комнат – 3 | 257 024,00 |
| 166 | **Квартира №28,** общ. пл. 134,7 кв. м, инв. №500/D-708121020, число комнат – 3 | 256 192,00 |
| 167 | **Квартира №32,** общ. пл. 134,6 кв. м, инв. №500/D-708121024, число комнат – 3 | 255 864,00 |
| 168 | **Квартира №35,** общ. пл. 95,6 кв. м, инв. №500/D-708121027, число комнат – 3 | 196 568,00 |
| 169 | **Квартира №36,** общ. пл. 134,8 кв. м, инв. №500/D-708121028, число комнат – 3 | 256 360,00 |
| 170 | **Квартира №64,** общ. пл. 135,8 кв. м, инв. №500/D-708121056, число комнат – 3 | 280 976,00 |
| 171 | **Квартира №115,** общ. пл. 160,9 кв. м, инв. №500/D-708121107, число комнат – 4 | 301 504,00 |
| 172 | **Квартира №119,** общ. пл. 160,9 кв. м, инв. №500/D-708121111, число комнат – 4 | 301 504,00 |
| 173 | **Квартира №123,** общ. пл. 161,7 кв. м, инв. №500/D-708121115, число комнат – 4 | 307 792,00 |
| 174 | **Квартира №125,** общ. пл. 82,9 кв. м, инв. №500/D-708121117, число комнат – 3 | 178 776,00 |
| 175 | **Квартира №127,** общ. пл. 161,3 кв. м, инв. №500/D-708121119, число комнат – 4 | 307 296,00 |
| 176 | **Квартира №131,** общ. пл. 161,2 кв. м, инв. №500/D-708121123, число комнат – 4 | 306 968,00 |
| 177 | **Квартира №135,** общ. пл. 161,0 кв. м, инв. №500/D-708121127, число комнат – 4 | 306 472,00 |
| 178 | **Квартира №139,** общ. пл. 161,2 кв. м, инв. №500/D-708121131, число комнат – 4 | 306 968,00 |
| 179 | **Квартира №158,** общ. пл. 161,9 кв. м, инв. №500/D-708121150, число комнат – 4 | 323 264,00 |
| 180 | **Квартира №166,** общ. пл. 161,6 кв. м, инв. №500/D-708121158, число комнат – 4 | 322 912,00 |

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с №BY60BLBB30120191021390001001; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – BY76BLBB30120191021390000004; в евро (EUR) – BY33BLBB30120191021390001002; в российских рублях (RUB) – BY22BLBB30120191021390001006; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

В течение 30 (тридцати) календарных дней со дня заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 22.09.2017

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **16.10.2017** в 14.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **12.10.2017** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. Email: auction@cpo.by |

З ТУРАМ ПА КРАІНЕ

## Песня ад віртуоза — найлепшы падарунак

**У рамках музычна-адукацыйнага праекта «Беларусь-тур», арганізаванага Міністэрствам культуры, РГА «Белая Русь», Асацыяцыяй беларускіх баяністаў і акардэаністаў, на Брэстшчыну завітаў музыкант-віртуоз, лаўрэат многіх міжнародных конкурсаў і фестываляў, а таксама Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, пераможца Вышэйшай лігі мэтраў сусветнага акардэона, кампазітар і выканаўца ўласных песень Ігар КВАШЭВІЧ.**

Турнэ па Беларусі, ініцыятарам якога стаў сам выканаўца, стартавала на яго малой радзіме ў Целяханах яшчэ ў верасні. Артыст плануе наведаць 120 раёнаў і абласныя цэнтры краіны, а завершыцца ўсё вялікім гала-канцэртам ў кінаканцэртнай зале «Мінск». Беразіно ж у гэтым спісе стала 91-м горадам! Спачатку Ігар Квашэвіч завітаў у аддзяленне кругласуточнага знаходжання для людзей пажылога ўзросту і інвалідаў Бярэзінскага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, што размешчаны ў вёсцы Дулебы. Прысутным так спадабалася ігра артыста на акардэоне, што яны праспявалі нават некалькі вясёлых частушак разам з музыкантам. У знак удзячнасці за ігру, цёплыя словы, гутарку, душэўны настрой загадчыца аддзялення Надзея Ісаева ўручыла Ігару невялічкі падарунак — вазу, зробленую ўласнымі рукамі бабуль і дзядуляў.

Наступны музычны «прыпынак» — школа мастацтваў у Беразіне. Найлепшым вучням раёна неверагодна пашанцавала: у гэты дзень яны мелі выдатную магчымасць сустрэцца і пагутарыць са знакамітым музыкантам. Акрамя таго, Ігар Квашэвіч правёў для школьнікаў майстар-клас, падзяліўся з імі сакрэтамі свайго майстэрства. Школьнікі ж задавалі пытанні, прасілі аўтограф, фатаграфаваліся.

**Падарунак за цудоўнае выступленне ўручае загадчыца аддзялення кругласуточнага знаходжання для людзей пажылога ўзросту і інвалідаў Надзея ІСАЕВА. Аўтограф ад Ігара Квашэвіча юным талентам у школе мастацтваў.**

А вечарам у раённым цэнтры культуры адбыўся канцэрт Ігара Квашэвіча. Сваім абаяннем, аптымізмам, прамяністай усмешкай, энергетыкай дабра артыст ужо з першых акордаў пакарыў публіку, якая цёпла прымала яго, не шкадуючы гарачых апладысментаў. Музыкант не толькі іграў на акардэоне, але і выконваў свае новыя творы з апошняга альбома «Поры года». Адкрыла вакальнае аддзяленне песня пад такой жа назвай, прагучалі кампазіцыі рознага эмацыянальнага зместу: «Карнавал», «Не забывай», «Дружба», «Салодкая парачка»...

— Праект «Беларусь-тур» задуманы не проста так. У яго два кірункі. Акрамя ўласна канцэртаў для масавай аўдыторыі, выконваю яшчэ адну немалаважную місію — асветніцкую, — падзяліўся са слухачамі Ігар Квашэвіч. — У кожным рэгіёне абавязкова выступаю з акадэмічнай праграмай у школах мастацтваў, даю майстар-класы юным выканаўцам, сустракаюся з іх выкладчыкамі. Хочацца верыць, што разам мы працуем на будучыню Беларусі.

**Юлія БУКЕЛЬ.**

# НЯМА ПЫТАННЯЎ. ЧУЖЫХ

**Алу Браніславаўну Губарэвіч у Дзяржынскім раёне добра ведаюць у першую чаргу як чалавека, які займае актыўную пазіцыю ў грамадскім жыцці. І не дзіва — староста вёскі, старшыня дзяржынскай раённай арганізацыі беларускай асацыяцыі дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам, малодшая медыцынская сястра Чырвонага Крыжа.**

**З дзецьмі пятай змены дзіцячага лагера.**

Ала Браніславаўна — староста сваёй роднай вёскі Гарбузы. Менавіта тут яна жыве, тут жывуць яе бацькі, таму ўсе пытанні для старасты — як свае. Два разы на год у вёсцы абавязкова наводзіцца парадак не толькі каля закінутых дамоў. З усімі ахвотнымі (а іх заўжды нямала) збіраюць смецце, чысцяць тэрыторыі вадаёмаў, даглядаюць могілкі. Акрамя таго, разам з юнымі валанцёрамі з Негарэльскай сярэдняй школы Ала Губарэвіч арганізавала шэфства над адзінокімі пажылымі жыхарамі. За ўдзел у вырашэнні праблем землякоў у 2010 годзе яна была абраная дэпутатам Негарэльскага сельскага Савета.

Каб было дзе бавіць вольныя вечары, асаблі-

**Вёска Гарбузы.**

**Ала ГУБАРЭВІЧ *(у цэнтры)* разам з бацькамі ў сваёй роднай вёсцы.**

ва калі пачынаецца холад, Ала Браніславаўна разам з блізкімі па духу, творчымі і актыўнымі аднавяскоўцамі стварылі ініцыятыўную групу «Спадчына».

— Калі ў бібліятэцы, калі ў мяне дома ладзім дзявочнікі, — усміхаецца жанчына. — П'ём гарбату, пірагі пячом і, вядома ж, спяваем...

Сямнаццаты год яна з'яўляецца нязменным старшынёй пярвічнай арганізацыі ГА «Беларуская асацыяцыя дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам». Таксама Ала Губарэвіч у ліку ініцыятараў штогадовага раённага фестывалю творчасці дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі «Запалі сваю зорку», а яшчэ — арганізатар пятай змены для дзетак з асаблівасцямі ў дзіцячым лагеры пасёлка Энергетыкаў «Дружба». Праблемы такіх малых — знаёмыя жанчыне, на жаль, не па чутках. Страта дачкі, цяжкае захворванне сына пакінулі зарубкі на сэрцы, але не зламалі моцны дух і рашучы характар. Больш за тое, Ала Браніславаўна знайшла ў сабе сілы быць надзейнай апорай і падтрымкай для многіх людзей.

**Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.**
*Дзяржынскі раён.*

## Цана паспешлівасці

**У сезон збору журавін адны шчыруюць на балоце, а іншыя... плацяць штрафы.**

Хоць на Палессі ўсе добра ведаюць, калі можна пачынаць нарыхтоўваць ягады, але ж многія паспяшаліся. Так, у Хатыніцкім лясніцтве Ганцавіцкага раёна дзве жанчыны збіралі журавіны за тры дні да афіцыйнага дазволу, а цяпер аплачваюць штрафы. Як расказаў **начальнік Ганцавіцкай міжраённай інспекцыі аховы жывёльнага і раслінnага свету Сяргей КРЫСЮК,** у кожнай з вядры было па кілаграме ягад. А штраф, кошт і кампенсацыя ўрону прыродзе ў суме пацягнулі на 62 рублі. Дарагавата, згадзіцеся, для кіло журавін.

Столінская міжраённая інспекцыя тым часам прыцягвае да адміністрацыйнай адказнасці асобных грамадзян Украіны. Жыхарам памежжа дазволена збіраць дзікаросы на асобных участках нашай тэрыторыі, але папярэдне грамадзяне суседняй краіны павінны заплаціць установленыя правіламі збор. Некаторыя ж так спяшаюцца па ягады, што пра аплату «забываюць». Вось і даводзіцца потым плаціць штраф.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

А НЕ ШКОДЗЬ!

## Па вугры — токам

**На беразе возера Нарач работнікі Мядзельскай міжрайінспекцыі, знаходзячыся ў начным рэйдзе, знайшлі электрычны кабель пад напружаннем, які тырчаў з зямлі. Да яго быў далучаны белы провад, другі канец якога сыходзіў у ваду.**

Неўзабаве з лесу да месца з кабелем выйшаў мужчына ў рыбалоўным касцюме і пайшоў уздоўж праваду. Парушальніка затрымалі, гэта быў мясцовы жыхар. Ён сцвярджаў, што рыбачыў пры дапамозе венцераў, якія, між іншым, таксама забаронены. Ці мае дачыненне грамадзянін да здабычы рыбы электратокам, установяць эксперты. А дзяржінспектары каля ўстаноўленага праваду знайшлі і дасталі з вады восем загінулых асобін вугра і двух лінёў агульнай вагой 10 кілаграмаў. Нанесеная прыродзе шкода ацэнена ў 20 700 рублёў. Заведзена крымінальная справа, падазраваны змешчаны пад варту.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**

**Адказны за выпуск: КАРПЕНКА Н.У.**
Грамадскі савет: **ГЕРАСІМОВІЧ С.М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **АСКЕРКА Ю.В.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **НАВУМЕНКА А.В.**, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008.** **Нумар падпісаны ў 19.30 3 кастрычніка 2017 года.**